Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчынв

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

_______________Д. В. Герасіменак
«___»________________ 20___ г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

_______________Ю. М. Галкоўская
«___»________________ 20___ г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# “УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ”
## Раздзел III. НОВЫ ЧАС

для спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны
Прафілізацыя: Культурная спадчына і турызм)

Складальнік:
Л.У. Ландзіна, доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны

Разгледжана і зацверджана на паседжанні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый 27. 06. 2024, пратакол № 10.

Рэцэнзенты:

кафедра філасофіі, гісторыі і метадалогіі адукацыі УА “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”;

І. Р. Чыкалава, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка”

Разгледжана і зацверджана на паседжанні кафедры гісторыка-культурнай спадчыны 28. 03. 2024, пратакол № 8.

ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……………………………………..5
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…………………………………………8
2.1 Лекцыя 1 *Уводзіны. Прадмет і задачы дысцыпліны*……………………….8
2.2 Лекцыя 2 *Эканамічнае, палітычнае і сацыякультурнае развіцце еўрапейскіх краін у XVI–XVIII ст*……………………………………………8
2.3 Лекцыя 3 *Рэфармацыя і яе распаўсюджванне ў Еўропе. Контррэфармацыя*…………………………………………………………9
2.4 Лекцыя 4 *Англія ў XVI ст*…………………………………………….10
2.5 Лекцыя 5 *Англія ў XVII–XVIII ст. Англійская буржуазная рэвалюцыя і фарміраванне парламенцкага ладу*…………………………………………..10
2.6 Лекцыя 6 *Францыя ў XVI–XVIII ст. Росквіт і заняпад французскага абсалютызма*……………………………………………………………….11
2.7 Лекцыя 7 *Дзяржавы аўстрыйскіх і іспанскіх Габсбургаў ў ранні Новы час*…………………………………………………………………………..11
2.8 Лекцыя 8 *Узвышэнне Прусіі і Брандэнбурга*………………………….12
2.9 Лекцыя 9 *Барацьба паўночнаамерыканскіх калоній Англіі за незалежнасць. Утварэнне ЗША*…………………………………………...12
2.10 Лекцыя 10 *Вялікая французская буржуазная рэвалюцыя*……………12
2.11 Лекцыя 11 *Тэрмідарыянскі пераварот. Дырэкторыя і Консульства*..13
2.12 Лекцыя 12 *Напалеонаўская Францыя і Еўропа*……………………...13
2.13 Лекцыя 13 “*Венская сістэма”. Развіцце міжнародных адносін у Еўропе ў XIX – пачатку XX ст*……………………………………………….14
2.14 Лекцыя 14 *Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіцце Еўропы ў XIX – пачатку XX ст*……………………………………………..14
2.15 Лекцыя 15 *Англія ў XIX – пачатку XX ст*……………………………….15
2.16 Лекцыя 16 *Францыя ў XIX – пачатку XX ст*……………………………16
2.17 Лекцыя 17 *Германія ў XIX – пачатку XX ст*……………………………16
2.18 Лекцыя 18 *Аўстрыйская імперыя ў XIX – пачатку XX ст*…………....17
2.19 Лекцыя 19 *Італія і Іспанія ў XIX – пачатку XX ст*……………………...17
2.20 Лекцыя 20 *ЗША ў XIX – пачатку XX ст*………………………………...17
2.21 Лекцыя 21 *Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін Усходу ў Новы час*….18
2.22 Лекцыя 22 *Асманская імперыя ў XVI – пачатку XX ст*………………18
2.23 Лекцыя 23 *Індыя ў XVI – пачатку XX ст*………………………………..19
2.24 Лекцыя 24 *Кітай XVI – пачатку XX ст*…………………………………19
2.25 Лекцыя 25 *Японія ў перыяд сёгуната і эпохі Мэйдзі*……………….....20

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
3.1 Семінарскі занятак 1 *Вялікія геаграфічныя адкрыцці і іх наступствы*.21
3.2 Семінарскі занятак 2 *Руская дзяржава ў XVI ст*…………………….....22
3.3 Семінарскі занятак 3.*Расійская дзяржава ў XVII ст*………………….....22
3.4 Семінарскі занятак 4 *Расійская імперыя ў I палове XVIII ст*…………..23
3.5 Семінарскі занятак 5. *Расійская імперыя ў II палове XVIII ст*………….24

3.6 Семінарскі занятак 6 *Расійская імперыя ў I палове XIX ст……………*25
3.7 Семінарскі занятак 7 *Рабочы рух і стварэнне I і II Інтэрнацыяналаў. Марксізм. Сацыялістычныя дактрыны другой паловы XIX– пачатку XX ст…………………………………………………………………………......*26
3.8 Семінарскі занятак 8 *Расійская імперыя ў II палове XIX ст…………….*27
3.9 Семінарскі занятак 9 *Расійская імперыя ў канцы XIX–пачатку XX ст.*27
3.10 Семінарскі занятак10 *Славянскія краіны і народы ў XIX–пачатку XX ст…………………………………………………………………………......*28
3.11 Семінарскі занятак 11 *Станаўленне незалежных дзяржаў у Лацінскай Амерыцы і іх развіцце ў XIX – пачатку XX ст…………………………………….*29
3.12 Семінарскі занятак 12 *Першая сусветная вайна. Асноўныя этапы ваенных дзеянняў. Уплыў вайны на развіцце заходняй цывілізацыі…………*30

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……………………………………….32
4.1 Заданні для кантралюемай самастойнай працы студэнтаў…………….32
4.2 Пералік пытанняў для экзамену (заліку)………………………………...35
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў………………38

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………………...40
5.1 Вучэбная праграма………………………………………………………..40
5.2 Асноўная літаратура………………………………………………………71
5.3 Дадатковая літаратура……………………………………………………72

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасным грамадстве вывучэнне і веданне гісторыі накіравана на фарміраванне асобы, якая павінна свядома арыентавацца ў грамадскім і культурным жыцці, разумець і аналізаваць тэндэнцыі і працэсы мінулага і сучаснага, ведаць і ацэньваць дасягненні духоўнай культуры. Пры гэтым засваенне ўсеагульнай гісторыі з’яўляецца неад’емнай часткай гістарычнай свядомасці асобы, таму што дае магчымасць асэнсавання і параўнання гістарычнага і культурнага развіцця сваей краіны сярод іншых. У максімальнай ступені актуальнымі з’яўляюцца веды па гісторыі для будучых спецыялістаў у сферы музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, дзе выкладанне ўсеагульнай гісторыі вядзецца, ў параўнанні з іншымі спецыяльнасцямі, паглыблена і ў значна большым аб’ёме.

Вывучэнне усеагульнай гісторыі новага часу прадугледжвае шчыльную сувязь разглядаемага матэрыяла з праблематыкай гісторыі сусветнай літаратуры і мастацтваў, культуралогіі, паліталогіі, гісторыі Беларусі, а таксама спуцыяльнымі гістарычнымі дысцыплінамі – гісторыяй матэрыяльнай культуры, нумізматыкай, генеалогіяй, геральдыкай і г.д.

Дысцыпліна “Усеагульная гісторыя (новы час)” вывучаецца студэнтамі спецыялізацыі “музеязнаўства і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” на II курсе (III семестр) у форме лекцый і семінарскіх заняткаў. Значнае месца (да паловы аб’ему матэрыяла ) адводзіцца для самастойнай работы студэнтаў. У канцы семестра праводзіцца экзамен. Формамі кантроля самастойнай работы выступаюць падрыхтоўка і абарона рэфератаў, абавязковае вынясенне тэматыкі СРС на экзамен і г.д.

Курс прадугледжвае разгляд гістарычных і культурных працэсаў XVI – пачатку XX ст. як еўрапейскай, так і азіяцкай і амерыканскай цывілізацый. У адпаведнасці з прынцыпам гістарызму і гісторыка-генетычным метадам матэрыял выкладаецца ў храналагічнай паслядоўнасці, разглядаюцца сацыяльна-эканамічныя, палітычныя, культурныя аспекты развіцця сусветнай супольнасці і асобных краін.. Асобна аналізуюцца праблемы, якія мелі агульнагістарычнае значэнне ці былі вызначальнымі тэндэнцыямі. Значная ўвага нададзена актуальным антрапалагічнаму і культуралагічнаму падыходам, а таксама гісторыі паўсядзеннасці, што ўвасабляецца не толькі ў вылучэнні пэўных на лекцыях і семінарах, але і ў адпаведным падборы літаратуры. Улічваючы асаблівасць падрыхтоўкі спецыялістаў – музеязнаўцаў, у праграме прысутнічае кола пытанняў, прысвечаных станаўленню і развіццю музея пры вывучэнні сацыякультурных працэсаў канкрэтных перыядаў.

Больш паловы гадзін адведзена для самастойнай работы, для якой вылучана шэраг тэм. У першую чаргу гэта блок, у якім разглядаецца гісторыя культуры новага часу, коратка адзначаная ў праграме, таму што па прычыне наяўнасці спецыяльных курсаў па гісторыі літаратуры, мастацтваў, матэрыяльнай культуры, тэорыі і гісторыі культуры і г.д. неаднаразовае паўтарэнне матэрыяла ва ўмовах аўдыторыі не прадстаўляецца мэтазгодным.

Для самастойнай работы могуць быць выдзелены праблемы, якія датычацца развіцця нееўрапейскіх цывілізацый, а таксама пытанні асноўнага матэрыяла.

*Мэтай* дысцыпліны «Усеагульная гісторыя. Новы час» з'яўляецца фарміраванне і развіццё прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў-музеязнаўцаў і прымянення атрыманых ведаў як ў прафесійнай сферы, так і ў штодзенным асяроддзі.

*Задачамі дысцыпліны з'яўляюцца:*

– вызначэнне месца і ролі перыяду гісторыі Новага часу ў агульным гістарычным працэссе разгортвання сусветнай цывілізацыі;
– вывучэнне асноўных праблем і тэндэнцый развіцця буйнейшых краін Еўропы, Азіі і Амерыкі ў Новы час;
– стварэнне цэласнай панарамнай карціны цывілізацыйнага працэса ў Новы час;
– раскрыццё праблематыкі зместу і перыядызацыі гісторыі Новага часу, сутнасці працэсаў і падзей з супастаўленнем і аналізам розных пунктаў гледжання;
– разуменне ўнутранай логікі і дынамікі гістарычных працэсаў і з'яў;
– акцэнтаванне ўвагі на сувязі палітычнай і эканамічнай гісторыі з працэсамі ў сферы сацыякультурнага развіцця;
– фарміраванне ў студэнтаў цэласнага светаўспрымання і разумення прыярытэта агульначалавечых каштоўнасцей у гісторыі;
– забеспячэнне пераемнасці матэрыялу выкладаемага курса з ведамі, атрыманымі ў агульнаадукацыйнай школе, а таксама ўзаемасувязі з матэрыяламі іншых дысцыплін, якія вывучаюцца ў ВНУ, праз міжпрадметныя сувязі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт *павінен ведаць:*

– крытэрыі перыядызацыі і змест гістарычных перыядаў;
– сутнасць, прычыны і наступствы гістарычных працэсаў і з'яў;
– асаблівасці рэвалюцыйнага і эвалюцыйнага шляхоў гістарычнага развіцця, а таксама традыцыйнага і мадэрнага грамадстваў;
– змяненне сацыякультурных умоў жыцця чалавека на працягу перыяда новага часу, у тым ліку сферы паўсядзеннасці.

Студэнт таксама *павінен умець:*

– выкарыстоўваць асноўныя і дадатковыя літаратуру і крыніцы;
– выяўляць міжпрадметныя сувязі з ведамі па гісторыі Беларусі, сусветнай літаратуры, мастацтва, матэрыяльнай культуры, а таксама курсаў культуралогіі, паліталогіі, філасофіі і г.д.
– чытаць, разумець і выкарыстоўваць інфармацыю гістарычных карт, дыяграм, схем, табліц і іншага ілюстрацыйнага матэрыяла;
– уключаць падзеі айчыннай гісторыі ў агульнагістарычны кантэкст;
– супастаўляць і ацэньваць розныя пункты гледжання ў гістарыяграфіі;
– разглядаць ва ўзаемнай сувязі і адзінстве працэсы палітычнага, эканамічнага і сацыякультурнага развіцця.

Рэалізацыя адзначаных задач прадугледжвае пастаяннае ўдасканальванне і апрацоўку матэрыяла, а таксама ўлік спецыфікі канкрэтнай аўдыторыі. Таму выкладчык можа (у межах адведзеных гадзін) ацэнтаваць увагу на тых ці іншых раздзелах і пытаннях, захоўваючы змест і агульныя прапорцыі матэрыялу выкладаемага курса. Спіс літаратуры носіць, асабліва ў дадатковай частцы, не імператыўны, а рэкамендацыйны характар. Гэта дае магчымасць для студэнта самастойнага пошуку і пашырэння кола крыніц, якія могуць уключаць, у тым ліку, электронныя і інтэрнэт-рэсурсы.

## ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

План-канспект лекцый

### *Лекцыя 1. Уводзіны. Прадмет і задачы дысцыпліны*

*1.Тэрміналагічны і храналагічны аспекты перыяду.* Паходжанне тэрміна “новая гісторыя”. Навістыка. Перыядызацыя і розныя падыходы да яе. Змест паняцця “ранні Новы час”.

*2. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сусветнай цывілізацыі ў ранні Новы час.* Выхад Еўропы на пазіцыі сусветнага лідэра. Прамысловая і аграрная рэвалюцыі. Фарміраванне індустрыяльнага грамадства. Буржуазныя рэвалюцыі і іх значэнне. Сацыяльна-палітычныя супярэчнасці новага часу. Сацыялістычныя дактрыны. Першая сусветная вайна як паказчык крызісу заходняй цывілізацыі.

*3. Ідэалагічныя дамінанты эпохі.* Адраджэнне, Рэфармацыя і Асвета як сацыяльныя і духоўныя рэвалюцыі новага часу. Разнастайнасць ідэйнага жыцця Еўропы і Амерыкі. Фарміраванне нацый і сучасных дзяржаў. Узнікненне ідэі правоў асобы і прававой дзяржавы. Секулярызацыя свядомасці. Навуковыя і культурныя дасягненні новага часу.

4. *Новы час у гістарыяграфіі.* Пачатак вывучэння новай гісторыі у Расійскай імперыі.“Руская школа” новай гісторыі і прыярытэты яе даследаванняў. Асноўныя накірункі вывучэння новай гісторыі ў савецкай гістарыяграфіі. Сучасная навістыка. Праблемы тэрміналогіі, пашырэнне тэматыкі даследаваняў.

### *Лекцыя 2 Эканамічнае, палітычнае і сацыякультурнае развіцце еўрапейскіх краін у XVI–XVIII ст.*

*1. Сацыяльная структура еўрапейскага грамадства і рэгіёны сацыяльна-эканамічнага развіцця.* Тыпалогія гаспадарчага і сацыяльнага развіцця Еўропы ў ранні новы час. Розныя мадэлі развіцця як преадумова складанасцей рэфармавання і культурнага трансфера. Расія – “даганяючая мадэль”. Капіталістычная і феадальная тэндэнцыі і іх суадносіны па рэгіёнах Еўропы. Мануфактурная вытворчасць, банкі, фарміраванне буржуазіі. Завяршэнне працэса запрыгоньвання і стварэнне таварнай феадальнай гаспадаркі. Англія і Галандыя як краіны пануючай капіталістычнай тэндэнцыі. Рэгіён спалучэня феадальных і капіталістычных структур (Францыя, Швецыя і інш.). Прычыны заняпаду Іспаніі, Партугаліі, Паўночнай Італіі, Паўднёвай Германіі. Рэгіён “другога выдання прыгонніцтва” (Чэхія, Венгрыя, Рэч Паспалітая, Расія, Прыбалтыка). Віды гандлю, накірункі гандлевых шляхоў.

*2. Спецыфіка дзяржаўнай будовы еўрапейскіх краін у ранні Новы час.* Палітычны лад вядучых краін Еўропы. Сутнасць абсалютызма і фактары яго фарміравання. Французскі абсалютызм – класічны варыянт абсалютнай манархіі. Манархіі іспанскіх і аўстрыйскіх Габсбургаў. Ваенна-бюракратычны характар манархіі ў Прусіі і Брандэнбургу. Асаблівасці абсалютнай манархіі ў

Швецыі. Расійскі абсалютызм і яго спецыфіка. “Стары парадак”, абсалютная манархія, абсалютызм, самадзержаўе: паняційныя адценні тэрмінаў.

3. *Сацыякультурнае развіцце Еўропы ў XVI – XVIII ст.* “Стары парадак”. Саслоўі і сацыяльныя групы. Уплыў Рэнесанса, Рэфармацыі, Контррэфармацыі, Асветніцтва на духоўныя прыярытэты і стандарты жыцця. “Куртуазнасць” і “цывілізаванасць”. Дэманаманія і рэлігійная нецярпімасць.

Рэнесанс, яго сацыякультурная і мастацкая складаючая. Барока і класіцызм. Італьянская культура як узор для Еўропы. Разгортванне навуковай рэвалюцыі. Якаснае змяненні ў светапоглядзе і ладзе жыцця ў эпоху Асветы. Дынаміка дэмаграфічнага становішча. Змяненні ў паўсядзённым жыцці – арганізацыі сям’і, выхаванні дзяцей, планаванні жылля, этыкеце, гігіене, харчаванні, вопратцы і г.д.

## *Лекцыя 3. Рэфармацыя і яе распаўсюджванне ў Еўропе. Контррэфармацыя*

*1.Тэрміналагічны і паняційны аспекты.* Сутнасць і вызначэнне Рэфармацыі. Раннія рэфармацыйныя рухі ў Еўропе. Становішча папства і роля папскай улады.

*2. Рэфармацыя ў Германіі.* Перадумовы і прычыны рэфармацыйнага руху. Гуманізм (Э. Ратэрдамскі, У. фон Гутэн і г.д.). Капіталістычныя і феадальныя элементы ў эканоміцы германскіх зямель. Раздробленасць Германіі. Роля каталіцкай царквы ў эканамічным і палітычным жыцці Германіі. Сацыяльныя супярэчнасці ў пачатку XVI ст. Таварыствы “Башмак” і “Бедны Конрад”. Актывізацыя рыцарства і гараджан. Гандаль індульгенцыямі. М. Лютэр і “95 тэзісаў”. Папская була 1521 г. Вормскі рэйхстаг 1521 г. Імператарскі эдыкт 1521 г. Лютэранская царква. Княжацкі, рыцарскі і сялянска-плебейскі кірункі Рэфармацыі. Рыцарскае паўстанне. Т. Мюнцэр. Вялікая Сялянская вайна. Праграмы паўстаўшых. Вынікі Рэфармацыі ў Германіі. Пратэстантызм. Аўгсбургскі рэлігійны мір. Фарміраванне германскага княжацкага абсалютызма.

*3. Распаўсюджанне Рэфармацыі ў еўрапейскіх краінах.* Рэфармацыйна рух у Швейцарыі. Цвінгліянства і кальвінізм. Правядзенне Рэфармацыі “зверху” ў Англіі. Дзейнасць Генрыха VIII. Акт аб супрэматыі. Англіканскі сімвал веры. Марыя Цюдор і Лізавета I. Правядзенне Рэфармацыі і ўмацаванне англійскай манархіі. Рэфармацыя ў Францыі. Каталікі і гугеноты. Рэлігійныя войны і барацьба за каралеўскі трон. Варфаламееўская ноч. Нанцкі эдыкт. Рэфармацыя ў скандынаўскіх краінах.

*4. Контррэфармацыя.* Сутнасць Контррэфармацыі. Тэрміны “канфесійная эпоха” і “каталіцкае адраджэнне”. Раскол Еўропы. Супрацьстаянне Англіі і Іспаніі. Дзейнасць інквізіцыі. Стварэнне, структура і дзейнасцо ордэна езуітаў. Трыдэнцкі сабор і яго значэннне. Уніяцкая царква.

## *Лекцыя 4. Англія ў XVI ст.*

*1. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Англіі.* Аграрны пераварот. Знікненне прыгонніцтва. Віды землекарыстання. Агаражванні. Пауперызацыя. Законы супраць бедных. Англійскія мануфактуры. Гандаль і купецтва. Асаблівасці саслоўнага ладу англійскага грамадства. Тытулованая і нетытулованая знаць. Сквайры, джэнтльмены, джэнтры.

*2. Англійскі абсалютызі і яго асаблівасці.* Усталяванне англійскага абсалютызма пры Генрыхе VII Цюдоры. Кансалідацыя краіны, узмацненне каралеўскай юрысдыкцыі, стварэнне “цюдараўскай арыстакратыі”. Умацаванне абсалютнай манархіі пры Генрыху VIII. Абсалютысцкая дактрына. Кароль і парламент. Мясцовае кіраванне і ўзброеныя сілы. Пачатак Рэфармацыі. Канфлікт Генрыха VIII з папай і разрыў з Рымам. “Акт аб супрэматыі”. Секулярызацыя царкоўных маёмасцей. Палітычны крызіс сярэдзіны стагоддзя. Эдуард VI і далейшае правядзенне Рэфармацыі. “42 артыкула веры”. Каталіцкая рэакцыя пры Марыі Цюдор.

Росквіт англійскага абсалютызма пры Лізавеце I. Дынаміка адносін манархіі і парламента. Рэлігійныя супярэчнасці і канчатковае ўсталяванне англіканізма. Супрацьстаянне з Рымам і каталіцкімі дзяржавамі. Лізавета I і Марыя Сцюарт. Вайна з Іспаніяй і гібель “Непераможнай армады”. Развіцце прамысловасці і гандлю, пратэкцыянізм. Меры па павышэнню прэстыжа манархіі і дзяржавы. Асоба Лізаветы I.

*3. Сацыякультурнае развіццё Англіі.* Росквіт англійскага Рэнесанса. Грамадская думка (Ф. Бэкан, Т. Мор і інш.). Тэатр і літаратура ( К. Марло, У. Шэкспір, паэты-лізавецінцы).

## *Лекцяя 5. Англія ў XVII – XVIII ст. Англійская буржуазная рэвалюцыя і фарміраванне парламентскага ладу*

*1.Перадумовы і прычыны рэвалюцыі.* Прыход да ўлады дынастыі Сцюартаў. Пурытанізм. Спрэчкі аб каралеўскай прэрагатыве. Абвастрэнне канфрантацыі пры Карле I. Буржуазна-дваранская апазіцыя і яе патрабаванні. Беспарламенцкае кіраванне. Паўстанне ў Шатландыі.

*2.Канфлікт манархіі і парламента і пачатак грамадзянскай вайны.* Тэрытарыяльны, канфесійны і сацыяльны падзел грамадства. А. Кромвель. Ідэйныя размежаванні паўстаўшых. Крызіс у арміі і канферэнцыя ў Пётні. “Прайдава чыстка” парламента і дамінаванне індэпэндэнтаў. Суд і смяротнае пакаранне караля.

*3. Індэпэндэнтская рэспубліка і яе ўнутрыпалітычныя складанасці.* Рух левелераў і дыгераў. Навігацыйны акт. Англа-галандская вайна. Заваяванне Ірландыі і Шатландыі. “Прылада кіравання”.

*4. Пратэктарат і рэстаўрацыя.* Нарастанне напружанасцей у краіне. Палітычны крызіс. Рэстаўрацыя Сцюартаў. Карл II. Кароль і парламент. “Habeas corpus act”. Вігі і торы. Якаў II і яго канфлікт з грамадствам. “Славутая рэвалюцыя”. Вільгельм III і “Біль аб правах”.

*5. Разгортванне аграрнага і прамысловага пераварота ў Англіі.* Развіцце канстытуцыйнай манархіі. "Акт аб наследаванні прастола". Гановерская дынастыя. Унія з Шатландыяй і абвяшчэнне Вялікабрытаніі. Геаргіанскае праўленне і ўмацаванне парламентарызма. Знешнепалітычныя поспехі Англіі і стварэнне каланіяльнай імперыі. Англійская выбарчая сістэма.

*6. Сацыякультурнае развіцце англійскага грамадства.* Фарміраванне і развіцце ідэй Асветы (Т. Гобс, Дж. Лок, Дж. Мільтан і інш,). Англійская літаратура, тэатр і публіцыстыка (Б. Мандэвіль, Р. Шэрыдан, Дж. Свіфт і інш.). Стандарты паўсядзеннага жыцця. Быт і норавы.

### *Лекцыя 6. Францыя ў XVI–XVIII ст. Росквіт і заняпад французскага абсалютызма*

*1.Асаблівасці фарміравання і палітычнай практыкі французскага абсалютызма.* Станаўленне абсалютнай манархіі пры Францыску I і Генрыху II. Войны са Свяшчэннай Рымскай імперыяй за Паўночную Італію. Распаўсюджанне рэфармацыйных ідэй. Гугеноты. Рэлігійныя войны і барацьба прыдворных груповак у сярэдзіне XVI ст. Кацярына Медычы і спробы ўсталявання кампраміса. Абвастрэнне рэлігійнага супрацьстаяння. Варфаламееўская ноч. Дынастычны крызіс. "Вайна трох Генрыхаў". Нанцкі эдыкт. Стабілізацыя краіны пры Генрыху IV.

*2. Францыя пры Рышэлье.*Сацыяльна-палітычны ідэал і мерапрыемствы кардынала Рышэлье ў розных сферах па ўмацаванню абсалютнай манархіі. Ацэнка асобы рышэлье ў гістарыяграфіі.

3. *"Стагоддзе Людовіка XIV".*Палітычная барацьба пасля смерці Людовіка XIII. Мазарыні і Фронда. Росквіт французскага абсалютызма пры Людовіку XIV. Кальбертызм. Знешняя палітыка Людовіка XIV. Адносіны з папствам. Рэлігійная нецярпімасць. Янсенізм і квіетызм.

*4. Рэгенцтва і Людовік XV.* Спробы ўрэгулявання рэлігійных і палітычных праблем. Манархія і парламенты. Фінансавыя праблемы манархіі і спробы іх вырашэння. "Сістэма Лоу". Спробы рэфармавання падатковай сістэмы. Францыя ў еўрапейскіх войнах XVIII ст.

*5. Сацыякультурнае развіцце французскага грамадства ў эпоху Рэнесанса і барока.*Філасофія і прававая думка (Ж. Бадэн, М. Мантэнь, Р. Дэкарт і г.д.). Прыдворная культура. Куртуазнасць і прэцыёзнасць. Французскі класіцызм (П. Карнэль, Ж-Б. Мальер, Н. Буало, Ж. дэ Лафантэн, Ж. Расін, М. Пусен і г.д.). Палітыка манархіі ў галіне культуры. Рышэлье і Мазарыні як буйнейшыя калекцыянеры твораў мастацтва. Уздым культуры і змяненне жыццёвых стандартаў у эпоху Асветы. Вальтэр, Д. Дыдро, Ш. Мантэск'е, Ж.-Ж. Русо і г.д. Энцыклапедысты. Фізіякраты. Літаратура і мастацтва (П. Бамаршэ, Ш. дэ Лакло, А.-Ф. Прэво, А. Вато, Ф. Бушэ, Ж.-Б. Шардэн, Ж.-Л. Давід і г.д.).

## *Лекцыя 7-8. Дзяржавы аўстрыйскіх і іспанскіх Габсбургаў ў ранні новы час. Узвышэнне Прусіі і Брандэнбурга*

*1. Тэрытарыяльная будова і палітычны лад Свяшчэннай Рымскай імперыі.* "Залатая була". Імперыя і папства. Развіцце германскіх зямель пасля Трыццацігадовай вайны. Узвышэнне Брандэнбурга. Мерапрыемствы Гогенцолернаў і складанне прускай мадэлі абсалютызма. Ператварэнне Прусіі ў каралеўства. Спецыфіка прускай абсалютнай манархіі. Эканамічная палітыка. Кантанальная рэформа. "Асвечаны абсалютызм" Фрыдрыха II. Эканамічная, палітычная і культурная роль Саксоніі. Аўстрыя як спадчынныя землі Габсбургаў. "Прагматычная санкцыя" і вайна за аўтрыйскую спадчыну. "Асвечаны абсалютызм" Марыі-Тэрэзіі. Іосіф II – "рэвалюцыянер на троне". Знешнепалітычныя прыярытэты Аўстрыі і Прусіі. Германскія дзяржавы ў перыяд Французскай рэвалюцыі і напалеонаўскіх войн.

*2. Лад жыцця і ментальнасць насельніцтва.* Сацыякультурная дзейнасць германскіх правіцеляў. Калекцыяніраванне і арганізацыя першай кунсткамеры ў Вене. Мастацкая калекцыя Рудольфа II. Заснаванне Дрэздэнскай карціннай галерэі. Выхад у Лейпцыгу першай германскай газеты. Развіццё універсітэтаў. Філасофія і навука (Г. Лейбніц, Г. Лесінг, Х. Вольф, І. Кант і г.д.). Росквіт музычнага мастацтва (І.-С. Бах, Х. Глюк, Г.Ф. Гендэль, Й. Гайдн, В.А. Моцарт і інш.).

*3. "Залаты век" Іспаніі.* Перадача Карлам V улады над Іспаніяй свайму сыну Філіпу. Росквіт магутнасці Іспаніі ў XVI ст. Асаблівасці іспанскага абсалютызма і роля грандаў. Аслабленне іспанскай манархіі ў XVII ст. Камарылья. Каталіцкая царква і супрацьстаянне іспанскіх Габсбургаў з пратэстанцкімі краінамі. Каланіяльныя валоданні Іспаніі. Спецыфіка эканамічнага развіцця і прычыны гаспадарчага рэгрэса. Выгнанне марыскаў і рэлігійная нецярпімасць. Вайна за іспанскую спадчыну. Усталяванне ў Іспаніі Бурбонаў і іх мерапрыемствы.

*4. Культурны ўздым Іспаніі ў ранні новы час.* Літаратура (М. Сервантэс, Л. дэ Вега, Ц. дэ Маліна, П. Кальдэрон, Ф. дэ Кеведа, Б. Грасіян), мастацтва (Эль Грэка, Х. дэ Рыбера, Д. Веласкес, Б. Э. Мурылья і інш).

## *Лекцыя 9. Барацьба паўночнаамерыканскіх калоній Англіі за незалежнасць. Утварэнне ЗША*

*1.Перадумовы вайны за незалежнасць.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё калоній. Крыніцы прытока насельніцтва. Рэгіянальныя адрозненні эканамічнага ладу. Рэлігійны склад насельніцтва. Палітыка метраполіі ў галіне эканомікі і кіравання. Рост апазіцыі. Ідэалагічнае абгрунтаванне амерыканскай рэвалюцыі (Т. Джэферсан, Б. Франклін). "Бостанскае піццё гарбаты".

*2. Пачатак ваенных дзеянняў і суадносіны сіл бакоў.* Плыні ў грамадстве і пануючым класе. Дэкларацыя незалежнасці. Вайна за незалежнасць і пазіцыі еўрапейскіх дзяржаў. Саюз з Францыяй і дапамога Іспаніі. "Узброены нейтралітэт". Версальскі мір.

*3. Гістарычнае значэнне і наступствы вайны за незалежнасць.* Канстытуцыя 1787 г. Паўстанне Д. Шэйса. “Біль аб правах”. Капіталістычнае развіцце ЗША і набыццё новых тэрыторый. Поўнач і Поўдзень. Адносіны амерыканцаў да карэннага насельніцтва.

### *Лекцыя 10. Вялікая французская буржуазная рэвалюцыя*

*1. Перадумовы і прычыны рэвалюцыі.* Нарастанне эканамічных і палітычных праблем абсалютнай манархіі. Прыход да ўлады Людовіка XVI, падзенне аўтарытэту манархіі. Рэформы Цюрго.

*2. Пачатак і ход рэвалюцыі.* Скліканне Генеральных штатаў і канфлікт саслоўяў з уладай. Узяцце Бастыліі. Установчы сход. Панаванне канстытуцыялістаў. Адмена феадальных павіннасцей. “Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна”. Канстытуцыя 1791 г. Рост рэвалюцыйных таварыстваў і клубаў. Варэнскі крызіс. Рост рэспубліканскага руху. Палітычная і сацыяльная дыферэнцыяцыя. Паўстанне 10 жніўня 1792 г. і прыход да ўлады жырандыстаў. Нацыянальны канвент. Устанаўленне рэспублікі.

*3. Французская рэвалюцыя і еўрапейскія манархіі.* Рэакцыя еўрапейскіх краін на падзеі ў Францыі. Пільніцкая дэкларацыя. Пачатак рэвалюцыйных войн. Арганізацыя жыцця ва ўмовах вайны. Перамогі французскай рэвалюцыйнай арміі. Супраціўленне рэвалюцыі. Вандэя. Нарастанне крызісных з’яў у эканоміцы. Агітацыя плебейскіх рэвалюцыянераў. Супярэчнасці ўнутры рэспубліканскага блока.

*4. Устанаўленне якабінскай дыктатуры.* Мерапрыемствы ў галіне палітыкі, эканомікі, рэлігіі, культуры. Канстытуцыя 1793 г. Якабінскі тэрор і праблема яго інтэрпрэтацыі ў гістарыяграфіі. Плыні і супярэчнасці ўнутры якабінскага блока. Крызіс якабінскай дыктатуры і яго складаючыя.

### *Лекцыя 11. Тэрмідарыянскі пераварот. Дырэкторыя і Консульства*

*1. Прычыны і ход пераварота 9 тэрмідора.* Сацыяльная база і мерапрыемствы новай улады. Выступленні мантаньяраў і раялістаў. Канстытуцыя 1795 г. Сістэма кіравання Дырэкторыі. Знешняя і ўнутраная палітыка. Працяг войн і знешнепалітычныя поспехі Францыі. Узрастанне апулярнасці Напалеона Банапарта. Нестабільнасць і “палітыка качэлей” унутры краіны. Г. Бабеф і “змова роўных”. Пагаршэнне знешнепалітычнай сітуацыі ў 1798 г. Егіпецкі паход Банапарта і яго няўдача. Вайна з другой антыфранцузскай кааліцыяй. Разгром французскіх войскаў у Італіі.

*2. Усталяванне Консульства.* Унутраная нестабільнасць і складанне базы для новага пераварота. Пераварот 9 лістапада 1799 г. Палітыка банапартызма. Сутнасць сістэмы Консульства. Асаблівасці Канстытуцыі 1799 г. Паўнамоцтвы першага консула, будова дзяржаўнага апарата, выбарчая сістэма. Раздрабленне заканадаўчай улады і падкантрольнасць консулу судовай. Сацыяльны арбітраж Напалеона. Канкардат 1801 г. з папай. Фінансавая і эканамічная стабілізацыя. Рэферэндум 1802 г. аб пажыццёвым кіраванні першага консула.

*3. Інтэрпрэтацыі характару і значэння Вялікай французскай рэвалюцыі ў гістарыяграфіі.* Праблемнае поля дыскусій. Традцыйныя трактоўкі ў еўрапейскай і савецкай гістарыяграфіі. Змяненне акцэнтаў і даскусіі ў савецкай гістарыяграфіі перыяду перабудовы. Новыя эндэнцыі постсавецкай гістарыяграфіі Французскай рэвалюцыі.

### *Лекцыя 12. Напалеонаўская Францыя і Еўропа*

*1. Усталяванне Першай імперыі і яе характар.* Перадумовы абвяшчэння Першай імперыі і яе сацыяльная база. Сутнасць банапартызма. Аднаўленне атрыбутаў манархічнай улады. Складанне новага імперскага дваранства. Напалеонаўскі кодэкс. Разгортванне прамысловай рэвалюцыі. Паліцэйская сістэма і цэнзура. Кантроль над перыядычным друкам, адукацыяй, літаратурай, мастацтвам. Паступовае складанне ліберальнай апазіцыі рэжыму Напалеона.

*2. Характар і мэты напалеонаўскіх войн.* Антыфранцузскія кааліцыі. Барацьба з Англіяй і кантынентальная блакада. Войны з Аўстрыяй і Прусіяй. Роля Расіі ў антыфранцузскіх кааліцыях. Тыльзіцкі мір. Стварэнне ў Еўропе Напалеонам дзяржаў – марыянетак. Буржуазныя ператварэнні ў заваяваных краінах. Вайна ў Іспаніі і супраціўленне мясцовага насельніцтва. Пагаршэнне адносін з Расіяй. Вайна 1812 г. і яе вынікі. “Бітва народаў” пры Лейпцыгу. Уступленне саюзных войскаў у Парыж. Адрачэнне Напалеона ад прастолу і высылка на в. Эльбу.

*3. Рэстаўрацыя Бурбонаў.* Бегства Напалеона з Эльбы і “сто дзён”. Паражэнне Напалеона пры Ватэрлоо. Выгнанне Напалеона на в. Св. Алены і заканчэнне яго жыцця. Асоба і дзейнасць Напалеона і іх ацэнкі ў гістарыяграфіі.

### *Лекцыя 13. “Венская сістэма”. Развіцце міжнародных адносін у Еўропе ў XIX – пачатку XX ст.*

*1. Венскі кангрэс і яго задачы.* “Венская сістэма”. Прынцып легітымізма. Манархічная рэстаўрацыя. Становішча Францыі. Роля Расіі на кангрэсе. Змены на палітычнай карце Еўропы. “Свяшчэнны саюз” і яго задачы. Дзейнасць “Свяшчэннага саюза” падчас рэвалюцый 20-х-40-х гг. XIX ст.

*2. “Усходняе пытанне”.* Заняпад Турцыі. Барацьба паўдневаславянскіх народаў за незалежнасць. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў Грэцыі і руска-турэцкая вайна 1828–1829 гг. Роля заходніх краін у атрыманні Грэцыяй незалнжнасці. Рост супярэчнасцей на Балканах. Буйнейшыя дзяржавы і іх інтарэсы. Крымская вайна і яе вынікі. Барацьба Расіі за ўмацаванне на Балканах у другой палове XIX ст. Руска-турэцкая вайна. Сан-Стэфанскі мір. Стварэнне новых дзяржаў на Балканах. Берлінскі кангрэс.

*3. Аб’яднанне Італіі і Германіі.* Уплыў на міжнароднае становішча аб’яднання Італіі і Германіі. Англа-германскія і франка-германскія супярэчнасці. Франка-пруская вайна. “Саюз трох імператараў”. Перадумовы зблíжэння Расіі і Францыі. Руска-германскія супярэчнасці. Складанне Траістага саюза і Антанты. Мілітарызацыя Еўропы. Гонка ўзбраенняў. Балканскія войны.

Сараеўскае забойства. Дыпламатычныя падзеі напярэдадні Першай сусветнай вайны.

### *Лекцыя 14. Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіцце Еўропы ў XIX – пачатку XX ст.*

*1. Еўропа – сусветны лідэр.* Набыццё Еўропай статусу сусветнага лідэра. Навукова-тэхнічны прагрэс. Прамысловы пераварот. Краіны-лідэры індустрыяльнага развіцця. Капіталізм даманапалістычны і манапалістычны. Віды манаполій. Банкаўская сістэма. Фінансавая алігархія. Вываз капітала за мяжу. Капіталістычныя адносіны ў аграрным сектары. Аграрная рэвалюцыя. Развіццё воднага транспарту, чыгункі, дарог. Урбанізацыя. Міграцыі і сацыяльная мабільнасць. Вынаходніцтвы ў металургіі, хімічнай прамысловасці, электратэхніцы, механіцы, фізіцы, хіміі, медыцыне і г.д. Навуковая рэвалюцыя і стварэнне новай карціны свету.

*2. Змяненне ўмоў паўсядзеннага жыцця.* Фарміраванне агульнадаступнай сістэмы навучання і масавай культуры. Спорт і турызм. Сацыякультурнае асяроддзе горада. Развіцце музеяў і выставачнай дзейнасці. Распаўсюджанне кінематографа. Эмансіпацыя жанчын, яе праявы і наступствы.

*3. Стварэнне і развіцце класаў буржуазнага грамадства.* Сацыяльныя кантрасты капіталістычнага ладу. Палітыка "начного вартаўніка" і філантропія. Капіталістычнае развіцце і дзяржаўная ўлада. Англійская палітычная эканомія. Мальтузіянства. Кансерватызм і ліберальны кансерватызм. Лібералізм класічны і сацыяльны.

*4. Развіццё буржуазнай дэмакратыі і заходняй палітычнай культуры.* Палітычны лад еўрапейскіх краін. Эксплуатацыя калоній. Падзел каланіяльных уладанняў. Нераўнамернасць эканамічнага і палітычнага развіцця краін як крыніца супярэчнасцей паміж імі.

*5. Каталіцкая царква і папства ў XIX ст.* "Сілабус". Сацыяльныя рэаліі і змены ў палітыцы царквы. Була "Рэрум наварум". Клерыкальная ідэалогія.

### *Лекцыя 15. Англія ў XIX – пачатку XX ст.*

*1. Эканамічнае развіццё краіны.* Завяршэнне прамысловага перавароту. Англія – "майстэрня свету". Асаблівасці сістэмы кіравання. Парламент. Двухпартыйная сістэма. Кабінет міністраў. Палітычная роля караля. Каралева Вікторыя і віктарыянская эпоха.

*2. Унутраная палітыка і сацыяльныя супярэчнасці.* Хлебныя законы. Становішча рабочага класа. Узнікненне фабрычнага заканадаўства. Чартызм. Трэд-юніянізм. Стварэнне лейбарысцкай партыі. Асаблівасці рабочага руху. І Інтэрнацыянал.

Недахопы выбарчай сістэмы. Першая і другая выбарчая рэформы. Законы аб галасаванні і трэцяя парламенцкая рэформа. Сацыяльнае заканадаўства другой паловы XIX ст. Ірландскае пытанне. Спалучэнне рэлігійных і палітычных супярэчнасцей. Феніі. "Маладая Ірландыя". Меры ўрада па рэгуляванні ірландскай праблемы.

*3. Каланіяльныя валоданні Англіі.* Брытанскае панаванне ў Індыі. Сутыкненне каланіяльных інтарэсаў Англіі і інтарэсамі буйнейшых еўрапейскіх краін. Англа-афганскія войны. Закабаленне Кітая. Опіумныя войны. Захоп Новай Зеландыі. Пашырэнне валоданняў Англіі у Канадзе.

*4. Знешняя палітыка Англіі.* Курс на падтрыманне “еўрапейскай раўнавагі”. Англа-рускія супярэчнасці ва “ўсходнім пытанні”. Адносіны з Турцыяй і Францыяй. Англа-германскае саперніцтва. Англія ў ваенных блоках напярэдадні Першай сусветнай вайны.

*5. Культура і лад жыцця англійскага грамадства.* Маральна-этычныя прыярытэты віктарыянскай эпохі. Навука і філасофія. Дарвінізм і пазітывізм. Рамантызм, рэалізм і дэкаданс у літаратуры (Дж. Байран, В. Скот, П. Шэлі, Дж. Кітс, Дж. Осцін, гатычны раман, Ч Дыкенс, У. Тэкерэй, Дж. Б. Шоу, О. Уайльд, Т. Эліот і г.д.). Англійскае мастацтва. Рэалісты і прэрафаэліты.

### *Лекцыя 16. Францыя ў XIX – пачатку XX ст.*

*1. Агульныя ўмовы развіцця краіны ў пачатку XIX ст.* Палітычныя групоўкі ў грамадстве. Рэжым Рэстаўрацыі. Людовік XVIII. Ультрараялізм. Карл X. Фарміраванне апазіцыі. Каралеўскія ардanaнсы 25 ліпеня 1830 г.. Ліпеньская рэвалюцыя. “Хартыя 1830 г.”. Луі-Філіп Арлеанскі – “кароль банкіраў”. Эканамічны ўздым. Сацыяльная палярызацыя грамадства. Становішча рабочага класа. Ліёнскае паўстанне. А. Бланкі, Л. Блан, Ж. Прудон. Прэм’ерства Ф. Гізо. Наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі.

*2. Рэвалюцыя 22 лютага 1848 г.* Часовы ўрад і яго склад. Мерапрыемствы буржуазных рэспубліканцаў. Люксембургская камісія і “нацыянальныя майстэрні”. Канстытуцыя Другой рэспублікі. Чэрвеньскае паўстанне. Рост сацыяльнай незадаволенасці. Палітычная дзейнасць Луі Напалеона.

*3. Устанаўленне Другой імперыі.* Дзяржаўны пераварот 2 снежня 1851 г. Сутнасць рэжыму Другой імперыі. Банапартызм. Эканамічны рост і дзелавая актыўнасць. Апазіцыйны рух у краіне. Знешняя палітыка Другой імперыі. Удзел у Крымскай вайне і аб’яднанні Італіі. Стварэнне каланіяльнай імперыі (Індакітай, Алжыр, замацаванне ў Егіпце, вайна ў Мексіцы). Франка-пруская вайна і яе вынік для Францыі.

*4. Рэвалюцыя 4 верасня 1870 г. і падзенне Другой імперыі.* Крызіс у грамадстве. Паўстанне ў Парыжы 18 сакавіка. Парыжская камуна і яе мерапрыемствы. Паражэнне Камуны і яе гістарычнае значэнне.

*5. Устанаўленне Трэцяй Рэспублікі.* Разнастайнасць партыйнага спектра. Палітычная нестабільнасць. Эканамічнае развіцце і рабочы рух у канцы XIX – пачатку XX ст. Знешняя палітыка Францыі ў пачатку XX ст.

*4. Духоўная культура Францыі.* Філасофія і навука. Літаратура (В. Гюго, П. Беранжэ, Стэндаль, Э. Заля, Г. Флабэр, Г. дэ Мапасан, А. Франс, Р. Ралан і інш.). Мастацтва: ад Ж.-Л. Давіда да П. Пікасо. Музыка (Г. Берлёз, Ж. Бізэ, Ш. Гуно, К. Сен-Санс і г.д.). Скульптура (А. Радэн). Тэатр.

### *Лекцыя 17. Германія ў XIX – пачатку XX ст.*

*1. Агульныя ўомвы развіцця краіны.* Дзяржаўная раздробленасць. Афармленне Германскага саюза. Дваістасць рэстаўрацыі ў Германіі. Прамысловы пераварот. Прускі шлях развіцця аграрных адносін. Юнкерства. Буржуазія. Фарміраванне пралетарыята. Эканамічны крызіс 1847 г. Паўстанне сілезскіх ткачоў.

*2. Рэвалюцыя 1848 г. у Заходняй і Паўднева-Заходняй Германіі.* Сакавіцкая рэвалюцыя ў Прусіі. Бадэнскае рэспубліканскае паўстанне. Дзейнасць К. Маркса і Ф. Энгельса. Франкфурцкі парламент. Дзяржаўны пераварот у Прусіі 9 лістапада 1848 г. Мантэйфельская канстытуцыя і закон аб выкупе сялянскіх павінасцей. Канстытуцыя 1849 г.

*3. Аўстра-прускі дуалізм і барацьба за гегемонію.* Аб'яднанне Германіі пад эгідай Прусіі. Абвяшчэнне Германскай імперыі. О. Бісмарк і яго палітычная праграма. Эканамічны рост, мадэрнізацыя і мілітарызацыя краіны. Улада і царква. "Культуркампф". Буржуазныя партыі. Рабочы рух і стварэнне сацыял-дэмакратычнай партыі. Роля СДПГ ў палітычным жыцці.

*4. Знешняя палітыка Германіі.* Франка-пруская вайна. Каланіяльныя інтарэсы Германіі. Англа-германскія супярэчнасці. Адносіны Германіі і Расіі. Германія ў сістэме Траістага саюза.

*5. Дасягненні духоўнай і матэрыяльнай культуры Германіі.* Класічная філасофія і філасофскія пошукі на мяжы XIX–XX ст. (Г. Гегель, Л. Фейербах, А. Шапенгаўэр, О. Шпенглер, Ф. Ніцшэ і г.д.). Германская навука і тэхніка. Літаратура (Ф. Шылер, В. Гётэ, Г. Гейнэ, браты Грым, Т. Шторм, Т. Фантанэ і інш.), музыка (Л. ван Бетховен, А. Шуман, К. Вебер, Р. Вагнер, і г.д.). Экспрэсіянізм ў мастацтве.

### *Лекцыя 18-19. Аўстрыйская імперыя ў XIX – пачатку XX ст. Італія і Іспанія ў XIX ст-пач. XX ст.*

*1. Этнанацыянальная структура імперыі і сістэма кіравання.* Палітычны лад. "Сістэма Меттэрніха". Легітымізм і кансерватызм. Асаблівасці эканамічнага развіцця. Наспяванне сацыяльных праблем.

*2. Сакавіцкая рэвалюцыя 1848 г. у Аўстрыі.* Рэвалюцыя ў Венгрыі, паўстанні ў Мілане і Венецыі. Нацыянальна-вызваленчы рух у славянскіх абласцях імперыі. Абвяшчэнне незалежнасці Венгрыі. Рэвалюцыйныя падзеі ў Вене. Ольмюцкая канстытуцыя. Вынікі рэвалюцый у Аўстрыі і Венгрыі.

*3. Развіцце краіны пасля рэвалюцыі.* Неаабсалютызм. Барацьба з Прусіяй за гегемонію. Аўстра-пруская вайна і бітва пры Садовай. Пагадненне 1867 г. і стварэнне дуалістычнай манархіі. Унутрыпалітычнае развіццё Аўстра-Венгрыі. Разгортванне прамысловага пераварота. Рабочы рух.

*4. Знешняя палітыка.* Габсбургская Аўстрыя і аб'яднанне Германіі і Італіі. Інтарэсы Аўстрыі ў Цэнтральнай Еўропе і на Балканах. Аўстра-Венгрыя ў сістэме блокаў напярэдадні Першай сусветнай вайны.

*5. Сацыякультурнае развіцце грамадства.* Навука. Тэхнічныя вынаходніцтвы. Тэатр. Музыка. Венская музычная школа.

### *Лекцыя 20. ЗША ў XIX – пачатку XX ст.*

*1. Умовы развіцця краіны.* Тэрытарыяльны рост ЗША і яго шляхі. Палітычны лад і кіраванне. “Джэксанаўская дэмакратыя”. Адносіны да карэннага насельніцтва. Каланізацыя Захаду. Англа-амерыканская вайна. Разгортванне прамысловага пераварота. Спецыфіка і праблемы Поўначы і Поўдня. Абаліцыянізм. Стварэнне дэмакратычнай і рэспубліканскай партый. Негрыцянскія паўстанні. Місурыйскі кампраміс. Рост напружанасці ў адносінах паміж паўднёвымі і паўночнымі штатамі.

*2. Вайна Поўначы і Поўдня.* Прэзідэнцтва А. Лінкальна. Грамадзянская вайна і яе перыяды. Закон аб гамстэдах. Адмена рабства. Перамога Поўначы. Рэканструкцыя. Змяненні на Поўдні. Палітычнае развіццё і расавая праблема.

*3. Асаблівасці эканомікі ЗША.* Завяршэнне прамысловага перавароту. Манаполіі і банкі. Вываз капітала за мяжу. “Амерыканскі шлях” развіцця аграрнага сектара. Фермерскі рух. Рабочы рух і прафсаюзная дзейнасць. Амерыканская федэрацыя працы. “Індустрыяльныя рабочыя свету”.

*4. Накірункі знешняй палітыкі ЗША.* ЗША і еўрапейскія краіны. Дактрына Манро. Панамерыканізм. “Палітыка вялікай дубінкі”. “Дыпламатыя долара”. Інтарэсы ЗША на Далекім усходзе.

*5. Амерыканскае грамадства і асаблівасці яго культурнага развіцця.* Спецыфіка амерыканскага светапогляду і ладу жыцця. Развіцце навукі і тэхнікі. Тэхнічныя вынаходніцтвы і іх аўтары (Т. Эдысан, В. Паўльсэн, Э. Берлінэр і г.д.). Літаратура (Г. Бічэр-Стоу, Б. Гарт, М. Твен, Дж. Лондан, Т. Драйзер і г.д.). Мастацкае калекцыяніраванне. Заснаванне Музея Метраполітэн ў Н’ю-Йорку, мастацкіх музеяў у Чыкага, Бостане, Філадэльфіі і г.д. Узнікненне Галівуда.

### *Лекцыя 21. Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін Усходу ў новы час*

*1. Тэрытарыяльнае распаўсюджанне ўсходніх цывілізацый.* Асаблівасці традыцыйнага грамадства. Рэлігійны фактар на Усходзе. Спалучэнне рэлігійных і філасофскіх плыняў у Кітаі і Японіі. Спецыфіка землеўладання і землекарыстання. Адносіны азіяцкіх краін з Еўропай. Асманская імперыя і яе сутыкненні ў еўрапейскімі краінамі. “Закрыццё” Кітая і Японіі. Заваяванне Індыі Англіяй.

*2. “Адкрыццё” Кітая і Японіі для Еўропы і яго наступствы.* Становішча азіяцкіх краін як калоній і паўкалоній еўрапейскіх краін. Іншаземны капітал і монакультурны характар эканомікі. Слабае развіццё нацыянальнай буржуазіі і няспеласць пралетарыята. Наяўнасць мноства прамежкавых сацыяльных груп. Рэлігійныя, племянныя, кланавыя, этнічныя фактары ва ўсходнім грамадстве. Мадэрнізацыя “зверху” на Усходзе. Паступовае разгортванне мадэрнізацыі ў традыцыйнвм грамадстве і ўплыў яе на культуру і паўсядзеннае жыццё.

*3. Супраціўленне ўсходніх краін і народаў каланіялізму.* Паўстанне бабідаў у Іране. Паўстанне тайпінаў у Кітаі. Сіпайскае паўстанне ў Індыі. Няўдалая спроба ператварэння ў калонію Афганістана. “Абуджэнне Азіі” ў пачатку XX ст. Асаблівасці нацыянальна-вызваленчай ідэалогіі і яе накірункі.

### *Лекцыя 22. Асманская імперыя ў XVI – пачатку XX ст.*

*1. Адміністрацыйная будова імперыі і становішча немусульманскага насельніцтва.* Сістэма ўлады. Феадальная іерархія. Дзейнасць Селіма I і Сулеймана Заканадаўцы (Сулеймана Цудоўнага). Ваенна-ленная сістэма, яе ўзнікненне, росквіт і заняпад. Гарады і рамествы. Крызіс ваенна-леннай сістэмы і спроба рэфармавання краіны. Рэформы Селіма III і Махмуда II. Тэхнічнае пераўзбраенне, стварэнне новай арміі. Крах рэформ і яго прычыны. “Новыя асманы”. Канстытуцыйнае пытанне. Абдул-Хамід II і ўвядзенне канстытуцыі. Устанаўленне “эпохі тыраніі”. Младатурэцкая рэвалюцыя 1908 г. і яе вынікі.

*2. Міжнароднае становішча Асманскай імперыі. Сутыкненні ў еўрапейскімі краінамі.* Месца Турцыі ў еўрапейскай дыпламатыі. Аслабленне імперыі. Руска-турэцкія войны. Знешнепалітычныя паражэнні і з’яўленне нераўнапраўных дагавароў. “Усходняе пытанне”. Паступовае разбурэнне імперыі і  стварэнне незалежных дзяржаў. Турцыя ў пачатку XX ст. і сістэме блокаў перыяду Першай сусветнай вайны.

*3. Культура Асманскай імперыі.* Роля іслама. Гарады і будаўніцтва. Культурная ізаляцыя краіны ў ранні новы час. Асаблівасці літаратуры і мастацтва. Паступовая мадэрнізацыя ісламскага грамадства. Новыя плыні ў літаратуры і грамадскай думцы ў пачатку XX ст.

### *Лекцыя 23. Індыя ў XVI – пачатку XX ст.*

*1. Стварэнне Імперыі Вялікіх Маголаў.* Унутраная палітыка першых правіцеляў. Рэформы Акбара і пашырэнне дзяржавы. Гаспадарка, гандаль, гарады. Асаблівасці сацыяльнага складу насельніцтва. Палітычны лад імперыі. Сепаратызм феадалаў і рэлігійныя праблемы краіны. Палітыка Аўрангзеба ў галіне рэлігіі і ўмацавання дзяржавы. Барацьба маратхаў. Антыфеадальныя рухі. Пранікненне партугальцаў у Індыю. Дзейнасць англійскай Ост-Індскай гандлевай кампаніі. Заваёва Індыі англічанамі.

*2. Сістэма англійскага каланіяльнага кіравання.* Наступствы англійскай эканамічнай экспансіі. Фарміраванне нацыянальнай інтэлігенцыі. Антыкаланіяльнае паўстанне сіпаеў ў 1857–1859 гг. Абуджэнне Індыі. Эканамічны рост, фарміраванне нацыянальнай буржуазіі і буржуазна-дэмакратычных партый. Стварэнне Індыйскага Нацыянальнага кангрэса і плыні ў ім. Дзейнасць Цілака. Нацыянальна-вызваленчы рух 1905–1908 гг. Бамбейская палітычная стачка. Індыя ў час Першай сусветнай вайны.

*3. Рэлігійныя і філасофскія сістэмы краіны.* Індуізм, Будызм, іслам. Адукацыя і навука. Гістарычныя хронікі. Літаратура (Т. Дас, Б. Рай, Р. Рой, Р. Тагор і інш.) Росквіт архітэктуры. Мастацтва (Шыва Даян Лал). Дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва.

### *Лекцыя 34. Кітай XVI – пачатку XX ст.*

*1. Асаблівасці сістэмы кіравання і дзяржаўнай будовы ў Кітаі.* Палітычная барацьба і спробы правядзення рэформ. Перыяд імперыі Мін. Экспедыцыя Чжэн Хэ. Гаспадарчае развіццё. Дзяржаўнае і прыватнае

землеўладанне. Узнікненне прыватнага і прадпрымальніцтва і прадпрыемстваў мануфактуанага тыпу. Сялянская вайна 1639–1644 гг. Усталяванне маньчжурскай дынастым Цын. Сістэма ўлады і кіравання Становішча карэннага насельніцтва.

*2. Пранікненне еўрапейцаў у Кітай.* Пачатак кітайска-рускіх адносін. Ізаляцыя краіны. “Адкрыццё” Кітая. Насяванне крызісных з’яў. Сялянскія паўстанні. І і ІІ опіўмныя войны. Дагаворы з Англіяй, Францыяй, ЗША, Расіяй. Наступствы еўрапейскай экспансіі. Замежны капітал у эканоміцы Кітая. Падзел Кітая на сферы ўплыву. Пачатак мадэрнізацыі. “Сто дзён рэформаў” і іх няўдача. Імператрыца Цысі. Паўстанне тайпінаў і яго вынікі. Барацьба іхэтуаней. Падаўленне народных паўстанняў. Канчатковае закабаленне Кітая заходнімі дзяржавамі.

*3. Дзейнасць Сунь Ятсэна і яго ідэі.* Рэвалюцыя 1911 – 1912 гг. Абвяшчэнне рэспублікі і палітычная барацьба. Юань Шыкай. Праблемы развіцця Кітая ва ўмовах эканамічнай і палітычнай раздробленасці.

-усведамленне цэласнасці сусветна-гістарычнага працэсу, сувязі і пераемнасці ў развіцці цывілізацый, краін і народаў;

-адлюстраванне паступовага разгортвання гістарычнага развіцця з выяўленнем краін – лідэраў у канкрэтныя эпохі, з разуменнем нераўнамернасці і пераемнасці гэтага працэса;

–сістэмнае бачанне гістарычнага працэса праз сінхранізацыю, аналогіі, параўнанне, вылучэнне сувязяў прычын і наступстваў;

-выхаванне павагі да гісторыка-культурнай спадчыны розных народаў, суаднясенне дасягненняў сусветнай і айчыннай матэрыяльнай і духоўнай культуры;

-забеспячэнне пераемнасці і ўзаемасувязі матэрыяла выкладаемага курса з ведамі, атрыманымі ў сярэдняй школе, а таксама са зместам сумежных дысцыплін праз міжпрадметныя сувязі.

У выніку вывучэння курса студэнт *павінен ведаць:*

-значэнне перыяду Новага часу ў сусветнай гісторыі, крытэрыі перыядызацыі, змест і структуру курса;

-асноўныя тэндэнцыі, працэсы і падзеі ў развіцці цывілізацый, краін і народаў;

-асаблівасці развіцця заходняй і усходняй цывілізацыйнай мадэлі;

-уплыў сацыяльных і культурных інстытутаў, якія склаліся ў Сярэднявеччы, на гістарычныя працэсы наступных перыядаў.

Студэнт павінен *умець:*
параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, выпрацоўваць і аргументаваць уласныя меркаванні;

-чытаць інфармацыю гістарычных карт, схем, дыяграм, а таксама ілюстрацыйнага матэрыялу;

-прымяняць у кантэксце разгляду сусветнай гісторыі веды па сумежных дысцыплінах (сусветнай мастацкай культуры, філасофіі, сусветнай літаратуры, рэлігіязнаўстве, культуралогіі, айчынай гісторыі і г.д.);

-аналізаваць гістарычныя працэсы і падзеі, ацэньваць гістарычныя з’явы і персаналіі.

– Зместам вучэбнай дысцыпліны “Усеагульная гісторыя. Раздзел 3. Новы час” прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках):

-ВК – 4 – Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

-ВК – 7 – Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадскасці і патрыятызма;

-БПК – 2 – Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцей, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыякультурную сітуацыю.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Усеагульная гісторыя. Раздзел 3. Новы час” прадугледжана 176 гадзін, з іх 76 аўдыторных і 20 гадзін самастойнай работ студэнтаў.. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 48 гадзін, семінарскія заняткі – 28 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

### Уводзіны

Паходжанне тэрміна “Новая гісторыя”. Перыядызацыя і розныя падыходы да яе. Змест паняцця “ранні Новы час”.

Гістарычны змест Новага часу. Выхад Еўропы на пазіцыі сусветнага лідэра. Адраджэнне, Рэфармацыя і Асвета як сацыяльныя і духоўныя

рэвалюцыі Новага часу. Фарміраванне індустрыяльнага грамадства. Буржуазныя рэвалюцыі і іх значэнне. Узнікненне ідэі правоў асобы і прававой дзяржавы. Сацыялістычныя дактрыны. Секулярызацыя свядомасці. Навуковыя і культурныя дасягненні новага часу. Першая сусветная вайна як паказчык крызісу заходняй цывілізацыі.

Пачатак вывучэння новай гісторыі. "Руская школа" новай гісторыі і прыярытэты яе даследаванняў. Асноўныя накірункі вывучэння новай гісторыі ў савецкай гістарыяграфіі. Сучасная навістыка.

## Раздзел І. Краіны Еўропы і Амерыкі ў XVI – XVIII ст.

### *Тэма 1. Эканамічнае, палітычнае і сацыякультурнае развіцце еўрапейскіх краін у XVI–XVIII ст.*

Тыпалогія гаспадарчага і сацыяльнага развіцця Еўропы ў ранні Новы час. Капіталістычная і феадальная тэндэнцыі. Мануфактурная вытворчасць, банкі, фарміраванне буржуазіі. Англія і Галандыя як краіны пануючай капіталістычнай тэндэнцыі. Рэгіён спалучэня феадальных і капіталістычных структур (Францыя, Швецыя і інш.). Прычыны заняпаду Іспаніі, Партугаліі, Паўночнай Італіі, Паўднёвай Германіі. Рэгіён "другога выдання прыгонніцтва" (Чэхія, Венгрыя, Рэч Паспалітая, Расія, Прыбалтыка).

Палітычны лад вядучых краін Еўропы. Сутнасць абсалютызма і фактары яго фарміравання. Французскі абсалютызм – класічны варыянт абсалютнай манархіі. Манархіі іспанскіх і аўстрыйскіх Габсбургаў. Ваенна-бюракратычны характар манархіі ў Прусіі і Брандэнбургу. Асаблівасці абсалютнай манархіі ў Швецыі. Расійскі абсалютызм і яго спецыфіка.

Сацыякультурнае развіцце Еўропы ў XVI–XVIII ст. "Стары парадак". Саслоўі і сацыяльныя групы. "Куртуазнасць" і "цывілізаванасць". Дэманаманія і рэлігійная нецярпімасць.

Рэнесанс, барока і класіцызм. Разгортванне навуковай рэвалюцыі. Якаснае змяненні ў светапоглядзе і ладзе жыцця. Дынаміка дэмаграфічнага становішча і змяненні ў паўсядзённым жыцці.

### *Тэма 2. Вялікія геаграфічныя адкрыцці і іх вынікі*

Сутнасць і перадумовы Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Экспедыцыя Б. Дыяса. Экспедыцыі Х. Калумба. Адкрыццё марского шляху ў Індыю. Каланіяльныя захопы партугальцаў на Індыйскім узбярэжжы. Адкрыццё Ціхага акіяна і Баранцава мора. Першае кругасветнае падарожжа. Ф. Магелан. Кругасветная экспедыцыя Ф. Дрэйка.

Экспедыцыя Ф. Картэса ў Мексіку. Заваяванне Перу Ф. Пісара. Каланіяльная сістэма Іспаніі і Партугаліі. Рабства. Сродкі калоній як аснова першапачатковага накаплення. Наступствы Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

Сацыяльная і этнічная структура, гаспадарка і кіраванне Лацінскай Амерыкі. Узаемны ўплыў еўрапейскай і мясцовых культур. Місіянерская дзейнасць каталіцкай царквы. Узнікненне культу Гуадалупскай Божай Маці. Літаратурная дзейнасць Б. дэ Лас Касаса і Х. Інэс дэ Ла Крус.

### *Тэма 3. Рэфармацыя і яе распаўсюджванне ў Еўропе. Контррэфармацыя*

Сутнасць і передумовы Рэфармацыі. Раннія рэфармацыйныя рухі. Роля папскай улады. Перадумовы Рэфармацыі ў Германіі. Гуманізм (Э. Ратэрдамскі, У. фон Гутэн і г.д.). Капіталістычныя і феадальныя элементы ў эканоміцы. Раздробленасць Германіі. Роля каталіцкай царквы.

Сацыяльныя супярэчнасці ў пачатку XVI ст. Таварыствы "Башмак" і "Бедны Конрад". Актывізацыя рыцарства і гараджан. Гандаль індульгенцыямі. М. Лютэр і "95 тэзісаў". Папская була 1521 г. Вормскі рэйхстаг 1521 г. Імператарскі эдыкт 1521 г. Лютэранская царква. Княжацкі, рыцарскі і сялянска-плебейскі кірункі Рэфармацыі. Рыцарскае паўстанне. Т. Мюнцэр. Вялікая Сялянская вайна. Праграмы паўстаўшых. Вынікі Рэфармацыі ў Германіі. Пратэстантызм. Аўгсбургскі рэлігійны мір. Фарміраванне германскага княжацкага абсалютызма.

Распаўсюджанне Рэфармацыі ў Швейцарыі. Цвінгліянства і кальвінізм. Правядзенне Рэфармацыі "зверху" ў Англіі. Дзейнасць Генрыха VIII. Акт аб супрэматыі. Англіканскі сімвал веры. Марыя Цюдор і Лізавета I. Правядзенне Рэфармацыі і ўмацаванне англійскай манархіі. Рэфармацыя ў Францыі. Католікі і гугеноты. Рэлігійныя войны і барацьба за каралеўскі трон. Варфаламееўская ноч. Нанцкі эдыкт.

Сутнасць Контррэфармацыі. Тэрміны "канфесійная эпоха" і "каталіцкае адраджэнне". Раскол Еўропы. Супрацьстаянне Англіі і Іспаніі. Дзейнасць інквізіцыі. Стварэнне, структура і дзейнасцо ордэна езуітаў. Трыдэнцкі сабор і яго значэннне. Уніяцкая царква.

### *Тэма 4. Нідэрландская буржуазная рэвалюцыя і яе значэнне*

Палітыка Іспаніі ў Нідэрландах. Рэлігійная сітуацыя ў краіне. Эканамічныя передумовы і нарастанне сацыяльнай напружанасці. Апазіцыя знаці і яе патрабаванні. Пачатак рэвалюцыі. Паўстанне іконаборцаў 1556 г. Дыктатура герцага Альбы. Лясныя і марскія гёзы. Планы В. Аранскага і дваранска-буржуазнай апазіцыі. Паўстанне 1572 г. "Генцкае супакаенне". "Вечны эдыкт" 1577 т. Араская і Утрэхтская уніі. Канчатковы разрыў Генеральных Штатаў з Філіпам II. Стварэнне Рэспублікі Аб'яднаных правінцый. Перамір'е 1609 г. і яго ўмовы. Перамога рэвалюцыі і яе значэнне.

Нідэрланды як рэгіён перадавых тэхналогій, мануфактурнай вытворчасці і інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі. Галандскія купцы ў міжнародным гандлі. Інтэлектуальнае і мастацкае жыцце Нідэрландаў. Развіцце філасофскай і палітычнай думкі (Г. Гроцый, Б. Спіноза).

### *Тэма 5. Міжнародныя адносіны ў XVI–XVIII стст.*

Секулярызацыя міждзяржаўных адносін, наданне прыярытэту інтарэсам суверэннай свецкай дзяржавы. Дынастычны характар войн. Кааліцыйныя войны і ідэя "раўнавагі сіл".

Палітычная карта Еўропы ў ранні Новы час. Раскол Еўропы на пратэстансткую і каталіцкую. Саперніцтва Англіі і Іспаніі. Фарміраванне каланіяльных імперый і падзел сфер уплыву паміж Іспаніяй і Партугаліяй. Прэтэнзіі Габсбургаў на еўрапейскую гегемонію. Барацьба за Паўночную Італію. Італьянскія войны. Росквіт Асманскай імперыі і пагроза турэцкага нашэсця для еўрапейскіх краін. Рост супярэчнасцей паміж Польшчай і Вялікім княствам Літоўскім і Рускай дзяржавай. Барацьба Расіі за выхад да Балтыйскага мора. Лівонская вайна і стварэнне Рэчы Паспалітай.

Трыццацігадовая вайна і яе наступствы. Уплыў Англійскай рэвалюцыі на міжнародныя адносіны. Узмацненне Швецыі. Апагей уплыву Францыі і войны Людовіка XIV. Узрастанне ўплыву Расіі і барацьба за выхад да Балтыйскага мора. Паўночная вайна. Аўстра-турэцкія і руска-турэцкія войны XVIII ст. і іх вынікі. Англа-французскае саперніцтва і аўстра-прускае супрацьстаянне. Захоп Англіяй канады і Ост-Індыі. Уваходжанне Расіі ў лік вялікіх еўрапейскіх дзяржаў. Вайна за іспанскую спадчыну, за польскую спадчыну, за аўстрыйскую спадчыну. Семігадовая вайна. Барацьба Англіі і Францыі ў калоніях. Вайна за незалежнасць паўночнаамерыканскіх калоній Англіі ў сістэме міжнародных адносін. Заняпад Рэчы Паспалітай і яе падзелы.

### *Тэма 6. Англія ў XVI ст.*

Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Англіі. Аграрны пераварот. Віды землекарыстання. Агаражванні. Паўперызацыя. Законы супраць бедных. Англійскія мануфактуры. Гандаль і купецтва. Асаблівасці саслоўнага ладу англійскага грамадства. Тытулованая і нетытулованая знаць. Сквайры, джэнтльмены, джэнтры.

Усталяванне англійскага абсалютызма пры Генрыхе VII Цюдоры, ўзмацненне каралеўскай юрысдыкцыі, стварэнне “цюдараўскай арыстакратыі”. Умацаванне абсалютнай манархіі пры Генрыху VIII. АКароль Пачатак Рэфармацыі. Канфлікт Генрыха VIII з папай і разрыў з Рымам. “Акт аб супрэматыі”. Секулярызацыя царкоўных маёмасцей. Палітычны крызіс сярэдзіны стагоддзя. Эдуард VI і далейшае правядзенне Рэфармацыі. “42 артыкула веры”. Каталіцкая рэакцыя пры Марыі Цюдор.

Росквіт англійскага абсалютызма пры Лізавеце I. Дынаміка адносін манархіі і парламента. Рэлігійныя супярэчнасці і ўсталяванне англіканізма. Лізавета I і Марыя Сцюарт. Вайна з Іспаніяй і гібель “Непераможнай армады”. Развіцце прамысловасці і гандлю, пратэкцыянізм. Асоба Лізаветы I. Росквіт англійскага Рэнесанса. Грамадская думка (Ф. Бэкан, Т. Мор і інш.). Тэатр і літаратура ( К. Марло, У. Шэкспір, паэты-лізавецінцы).

### *Тэма 7. Англія ў XVII–XVIII ст. Англійская буржуазная рэвалюцыя і фарміраванне парламентскага ладу*

Прыход да ўлады дынастыі Сцюартаў. Пурытанізм. Спрэчкі аб каралеўскай прэрагатыве. Абвастрэнне канфрантацыі пры Карле I. Беспарламенцкае кіраванне. Паўстанне ў Шатландыі. Канфлікт манархіі і

парламента і пачатак грамадзянскай вайны. А. Кромвель. Плыні сярод паўстаўшых. Крызіс у арміі і канферэнцыя ў Пётні. “Прайдава чыстка” парламента і дамінаванне індэпэндэнтаў. Суд і смяротнае пакаранне караля.

Індэпэндэнтская рэспубліка і яе ўнутрыпалітычныя складанасці. Рух левелераў і дыгераў. Навігацыйны акт. Англа-галандская вайна. Заваяванне Ірландыі і Шатландыі. Пратэктарат Кромвеля. Палітычны крызіс. Рэстаўрацыя Сцюартаў. Карл II. “Habeas corpus act”. Вігі і торы. Якаў II і яго канфлікт з грамадствам. “Славутая рэвалюцыя”. Вільгельм III і “Біль аб правах”.

Разгортванне аграрнага і прамысловага пераварота ў Англіі. Развіцце канстытуцыйнай манархіі. “Акт аб наследаванні прастола”. Гановерская дынастыя. Унія з Шатландыяй і абвяшчэнне Вялікабрытаніі. Геаргіанскае праўленне і ўмацаванне парламентарызма. Знешнепалітычныя поспехі Англіі і стварэнне каланіяльнай імперыі. Англійская выбарчая сістэма.

Сацыякультурнае развіцце англійскага грамадства. Фарміраванне і развіцце ідэй Асветы (Т. Гобс, Дж. Лок, Дж. Мільтан і інш,). Англійская літаратура, тэатр і публіцыстыка (Б. Мандэвіль, Р. Шэрыдан, Дж. Свіфт і інш.).

### *Тэма 8. Францыя ў XVI–XVIII ст. Росквіт і заняпад французскага абсалютызма*

Асаблівасці фарміравання французскага абсалютызма. Станаўленне абсалютнай манархіі пры Францыску I і Генрыху II. Італьянскія войны. Распаўсюджанне рэфармацыйных ідэй. Гугеноты. Рэлігійныя войны і барацьба прыдворных груповак. Кацярына Медычы і спробы ўсталявання кампраміса. Варфаламееўская ноч. Дынастычны крызіс. “Вайна трох Генрыхаў”. Нанцкі эдыкт. Стабілізацыя краіны пры Генрыху IV.

Сацыяльна-палітычны ідэал і мерапрыемствы кардынала Рышэлье. Палітычная барацьба пасля смерці Людовіка XIII. Мазарыні і Фронда. Росквіт французскага абсалютызма пры Людовіку XIV. Кальбертызм. Знешняя палітыка Людовіка XIV. Рэлігійная нецярпімасць. Янсенізм і квіетызм.

Рэгенцтва. Людовік XV і яго спробы ўрэгулявання рэлігійных і палітычных праблем. Манархія і парламенты. Спробы рэфармавання падатковай сістэмы. Францыя ў еўрапейскіх войнах XVIII ст.

Сацыякультурнае развіцце французскага грамадства ў эпоху Рэнесанса. Філасофія і прававая думка (Ж. Бадэн, М. Мантэнь, Р. Дэкарт і г.д.). Прыдворная культура. Куртуазнасць і прэцыёзнасць. Французскі класіцызм (П. Карнэль, Ж-Б. Мальер, Н. Буало, Ж. дэ Лафантэн, Ж. Расін, М. Пусен і г.д.). Палітыка манархіі ў галіне культуры. Рышэлье і Мазарыні як буйнейшыя калекцыянеры твораў мастацтва. Змяненне жыццёвых стандартаў у эпоху Асветы. Французскія асветнікі (Вальтэр, Д. Дыдро, Ш. Мантэск’е, Ж.-Ж. Русо і г.д.). Фізіякраты. “Энцыклапедыя”. Літаратура і мастацтва (П. Бамаршэ, Ш. дэ Лакло, А.-Ф. Прэво, А. Вато, Ф. Бушэ, Ж.-Б. Шардэн, Ж.-Л. Давід і г.д.).

### *Тэма 9. Дзяржавы аўстрыйскіх і іспанскіх Габсбургаў ў ранні Новы час*

Тэрытарыяльная будова і палітычны лад Свяшчэннай Рымскай імперыі. “Залатая була”. Імперыя і папства. Аўстрыя як спадчынныя землі Габсбургаў. “Прагматычная санкцыя” і вайна за аўтрыйскую спадчыну. “Асвечаны абсалютызм” Марыі-Тэрэзіі. Іосіф ІІ – “рэвалюцыянер на троне”. Знешнепалітычныя прыярытэты Аўстрыі.

Мецэнатская дзейнасць Габсбургаў. Калекцыяніраванне і арганізацыя першай кунсткамеры ў Вене. Мастацкая калекцыя Рудольфа ІІ. Венская класічная школа ў музычным мастацтве (Й. Гайдн, В. А. Моцарт і інш.).

Перадача Карлам V улады над Іспаніяй свайму сыну Філіпу. Асаблівасці іспанскага абсалютызма. Аслабленне іспанскай манархіі ў XVII ст. Камарылья. Супрацьстаянне іспанскіх Габсбургаў з пратэстанцкімі краінамі. Каланіяльныя валоданні Іспаніі. Спецыфіка эканамічнага развіцця і прычыны гаспадарчага рэгрэса. Выгнанне марыскаў і рэлігійная нецярпімасць. Вайна за іспанскую спадчыну. Усталяванне ў Іспаніі Бурбонаў і іх мерапрыемствы.

Культурны ўздыі Іспаніі ў ранні Новы час. Літаратура (М. Сервантэс, Л. дэ Вега, Ц. дэ Маліна, П. Кальдэрон, Ф. дэ Кеведа, Б. Грасіян), мастацтва (Эль Грэка, Х. дэ Рыбера, Д. Веласкес, Б. Э. Мурыльа і інш).

### *Тэма 10. Узвышэнне Прусіі і Брандэнбурга*

Развіцце германскіх зямель пасля Трыццацігадовай вайны. Узвышэнне Брандэнбурга. Мерапрыемствы Гогенцолернаў і складанне прускай мадэлі абсалютызма. Ператварэнне Прусіі ў каралеўства. Спецыфіка прускай абсалютнай манархіі. Эканамічная палітыка. Кантанальная рэформа. “Асвечаны абсалютызм” Фрыдрыха ІІ. Эканамічная, палітычная і культурная роль Саксоніі. Знешнепалітычныя прыярытэты Прусіі. Удзел яе ў вайне за Айтсрйскую спадчыну і Сямігадовай вайне. Германскія дзяржавы ў перыяд Французскай рэвалюцыі і напалеонаўскіх войн.

Культурнае развіццё германскіх зямель. Мецэнатва. Заснаванне Дрэздэнскай карціннай галерэі. Выхад у Лейпцыгу першай германскай газеты. Развіццё універсітэтаў. Філасофія і навука (Г. Лейбніц, Г. Лесінг, Х. Вольф, І. Кант і г.д.). Германская музыка эпохі барока (І.-С. Бах, Х. Глюк, Г.Ф. Гендэль і інш.) Асветніцтва ў Германіі (І. Гётэ, Г. Лесінг, Ф. Шылер і інш).

### *Тэма 11. Скандынаўскія краіны ў ранні Новы час. Швецыя ў XVI–XVIII ст.*

Швецыя, Данія і Нарвегія ва ўмовах Кальмарскай уніі. Адасабленне Швецыі. Крысціян ІІ і ўмацаванне каралеўскай улады ў Даніі. Уварванне ў Швецыю і “стакгольмская крывавая баня”. Нацыянальна-вызваленчае паўстанне і прыход да ўлады дынастыі Ваза ў Швецыі.

Правядзенне Рэфармацыі “зверху” і ўмацаванні каралеўскай ўлады пры Густаве І Вазе. Руска-шведскія адносіны. Лівонская вайна і пашырэнне шведскіх уладанняў. Дзяржаўны пераварот 1568 г. Прыход да ўлады Юхана Вазы. Саюз з Рэччу Паспалітай. Апазіцыйны рух у Швецыі і руска-шведскае збліжэнне. Замацаванне Швецыі на Фінскім заліве і ў Карэліі. Густаў ІІ Адольф

і развіццё шведскага абсалютызма. Швецыя ў Трыццацігадовай вайне. Актывізацыя знешняй палітыкі пры Карле X Густаве і вайна супраць Рэчы Паспалітай. Палітычны крызіс у краіне і меры Карла XI па ўмацаванню асабістай улады. Карл XII і Вялікая Паўночная вайна. Паражэнне Швецыі ў Паўночнай вайне і пачатак крызіса шведскага абсалютызма. Данія і Швецыя ў перыяд "асвечанага абсалютызма". Манархічны крызіс у Даніі і рэформы І. Струэнзе. Узмацненне ролі арыстакратыі ў Швецыі пасля смерці Карла XII. "Форма праўлення" і ўсталяванне ў Швецыі абмежванай манархіі. "Калпакі" і "капялюшы". Густаў III і частковае аднаўленне абсалютызма. Швецыя ў антыфранцузскіх кааліцыях.

Асаблівасці сацыяльнага ладу Швецыі. Свабодныя сяляне і гараджане як апора манархіі. Эканамічнае развіццё скандынаўскіх краін. Аграрны ўздым XVI ст. Катэгорыі сялянства ў Швецыі, Даніі і Нарвегіі. Развіццё мануфактур і роля дзяржавы ў мануфактурнай вытворчасці. Знешні ў ўнутраны гандаль.

### *Тэма 12. Еўрапейскае Адраджэнне*

Значэнне тэрміна "Адраджэнне" і фактары развіцця рэнесанснай культуры. Супярэчнасці ідэалогіі і практыкі Рэнесанса.

Італьянскі Рэнесанс як ўзор для Еўропы. Гуманізм. Збіральніцтва прыватных калекцый і стварэнне першых музейных установ. Чынквічэнта. "Тытаны Адраджэння" (Л. Арыёста, Мікеланджэла, Л. да Вінчы, Тыцыян, Б. Чэліні, Караваджа, Дж. Берніні і інш.). Маньерызм. Асаблівасці французскага Адраджэння. Росквіт рэнесанснай літаратуры (Ф. Рабле, Ж. дю Беле, П. Рансар, К. Маро, М. Наварская і інш.). Прыдворная культура. Куртуазнасць. Англійскі Рэнесанс. Грамадская думка (Ф. Бэкан, Т. Мор і інш.). Тэатр і літаратура ( К. Марло, У. Шэкспір, паэты-лізавецінцы). "Паўночнае Адраджэнне". Галандская і фламандская школы жывапісу (І. Босх, П. Брэйгель Старэйшы, Ф. Рэмбрандт, П. Рубенс, Ф. Халс і інш.).

### *Тэма 13. Расійская дзяржава ў XVI–XVII ст.*

Тэрыторыя і насельніцтва. Гаспадарчае развіцце. Класы і саслоўныя групы. Сістэма ўлады. Умацаванне дзяржавы пры Іване III і Васілі III. Сутыкненні з Вялікім княствам Літоўскім. "Масква – трэці Рым". Іван IV. "Выбраная рада". Судзебнік 1550 г. Адмена кармленняў. Апрычніна і яе значэнне. Знешняя палітыка. Далучэнне Казані і Астрахані. Лівонская вайна.

Дынастычны крызіс. Смерць царэвіча Дзмітрыя. Праўленне Барыса Гадунова. Гаспадарчая катастрофа пачатку XVII ст. Ілжэдзмітрый І. Умяшальніцтва Рэчы Паспалітай і ідэя далучэння рускіх зямель. Васіль Шуйскі. Паўстанне І. Балотнікава. Ілжэдзмітрый ІІ. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай. "Сямібаяршчына". Першае і другое апалчэнне. Выбранне царом Міхаіла Раманава. Аднаўленне краіны пасля Смуты. Адносіны Расіі са Швецыяй і Рэччу Паспалітай.

Праўленне Аляксея Міхайлавіча і ўмацаванне абсалютызму. Саборнае ўлажэнне. Дзяржава і царква. Раскол. Пераемнікі Аляксея Міхайлавіча.

Эканамічнае развіцце Расіі. Першыя мануфактуры. Фарміраванне ўсерасійскага рынка. “Бунташны век”. “Медны бунт”. “Саляны бунт”. Сялянская вайна пад кіраўніцтвам С. Разіна. Знешняя палітыкі Расіі. Украіна і вайна з Рэччу Паспалітай. Руска-шведскія і руска-турэцкія адносіны.

“Абміршчэнне” культуры. “Дамастрой” як нарматыўны звод паўсядзеннага жыцця. Адукацыя. Заснаванне Славяна-грэка-лацінскай акадэміі. Літаратура. Народная творчасць. Іканапіс. Зараджэнне тэатра.

### *Тэма 14. Расійская імперыя ў XVIII ст.*

Петр I і яго рэформы. Палітычны ідэал Пятра. Становішча праваслаўнай царквы. Паўночная вайна. Пруцкі паход. Выхад Расіі да Балтыйскага мора і абвяшчэнне Расійскай імперыі.

Барацьба за ўладу пасля смерці Пятра I. Меньшыкаў. Кацярына I. Петр II. Спроба абмежавання манархіі. Ганна Іаанаўна. Біронаўшчына. Знешняя палітыка Расіі. Лізавета Пятроўна і стабілізацыя краіны. Рост прывілеяў дваранства. Удзел Расіі ў Сямігадовай вайне. Руска-турэцкія адносіны. Петр III. Маніфест аб вольнасці дваранства, секулярызацыя царкоўных зямель. Змены ў знешняй палітыцы. Пераварот 1762 г.

Кацярына II і “асветны абсалютызм”. “Наказ” і дзейнасць Улажэннай камісіі. Сялянскае пытанне. Сялянская вайна пад кіраўніцтвам Е. Пугачова і яе наступствы. Змены ў палітычным курсе пад уплывам Вялікай французскай рэвалюцыі. Міжнароднае становішча Расіі. Руска-турэцкія войны і выхад да Чорнага мора. “Грэчаскі праект”. Руска-шведскія адносіны. Падзелы Рэчы Паспалітай. Змены ва ўнутранай і знешняй палітыцы пры Паўле I. Супярэчнасці кіравання. Рост палітычнай напружанасці і забойства Паўла I.

Значэнне пятроўскіх рэформ і “асветнага абсалютызма”. Адкрыццё Акадэміі навук і Маскоўскага універсітэта. Заснаванне Кунсткамеры і Эрмітажа. Дзейнасць М. В. Ламаносава. Класіцызм ў літаратуры (А. П. Сумарокаў, М. В. Ламаносаў, Д. В. Фанвізін, Г. Р. Дзяржавін і г.д.). Асветніцтва (М. І. Новікаў, А. М. Радзішчаў). Выяўленчае мастацтва і музыка (Ф. С. Рокатаў, Д. Р. Лявіцкі, У. Л. Баравікоўскі, А. П. Ласенка, С. Ф. Шчадрын, Д. С. Бартнянскі і інш.). Архітэктура і скульптура класіцызма (М. Казакоў, В. Бажэнаў, Э. Фальканэ, Ф. Шубін). Еўрапеізацыя побыту і нораваў.

### *Тэма 15. Славянскія народы ў ранні Новы час*

Усталяванне фальваркавай гаспадаркі і прыгонніцтва ў Польшчы і Вялікім княстве Літоўскім. “Валочная памера”. Сацыяльныя канфлікты ў XVI–XVII ст. Рэфармацыя і яе спецыфіка ў Польшчы. Арыентацыя Польшчы на Габсбургаў. Пераход Прусіі і Курляндыі ў васальную залежнасць ад Польшчы. Заключэнне Люблінскай уніі. Узрастанне ролі шляхты і сойма. Адсутнасць мяшчанства ў сойме Рэчы Паспалітай. Знешняя палітыка. Адносіны ў Расіяй і Швецыяй. Лівонская вайна і Смута ў Расіі. “Крывавы патоп” і пачатак заняпаду Рэчы Паспалітай. Рэч Паспалітая ў планах суседніх дзяржаў. Паўночная вайна.

“Саскія часы” і ўплыў Расіі. Нацыянальныя і рэлігійныя супярэчнасці. Магнацкая анархія. Тры падзелы Рэчы Паспалітай.

Уключэнне Чэхіі ў склад імперыі Габсбургаў. Чэшскае паўстанне 1618–1620 гг. і ператварэнне Чэхіі ў правінцыю. Сельская гаспадарка і прамысловасць. Становішча сялянства. Рэлігійныя супярэчнасці ў Чэхіі і Багеміі. Паўстанне ў Празе і пачатак Трыццацігадовай вайны. Нацыянальнаге адраджэнне ў Чэхіі ў канцы XVIII ст.

Уваходжанне ў склад Асманскай імперыі Македоніі, Балгарыі, Сербіі, Грэцыі, Албаніі, Босніі і Герцагавіны. Харватыя як тэрыторыя Турцыі, Аўстрыі і Венецыі. Ісламізацыя. “Падатак крывёй”. Барацьба супраць турэцкага панавання. Рухі гайдукаў і ўскокаў.

### *Тэма 16. Барацьба паўночнаамерыканскіх калоній Англіі за незалежнасць. Утварэнне ЗША*

Перадумовы вайны за незалежнасць. Крыніцы прытока насельніцтва. Рэгіянальныя адрозненні эканамічнага ладу. Рэлігійны склад насельніцтва. Палітыка метраполіі ў галіне эканомікі і кіравання. Рост апазіцыі. Ідэалагічнае абгрунтаванне амерыканскай рэвалюцыі (Т. Джэферсан, Б. Франклін). “Бостанскае піццё гарбаты”. Пачатак ваенных дзеянняў і суадносіны сіл бакоў. Плыні ў грамадстве і пануючым класе. Дэкларацыя незалежнасці. Вайна за незалежнасць і пазіцыя еўрапейскіх дзяржаў. Саюз з Францыяй і дапамога Іспаніі. “Узброены нейтралітэт”. Версальскі мір.

Канстытуцыя 1787 г. Паўстанне Д. Шэйса. “Біль аб правах”. Капіталістычнае развіцце ЗША і набыццё новых тэрыторый. Поўнач і Поўдзень. Адносіны амерыканцаў да карэннага насельніцтва.

### *Тэма 17. Вялікая французская буржуазная рэвалюцыя*

Нарастанне эканамічных і палітычных праблем абсалютнай манархіі. Прыход да ўлады Людовіка XVI, спробы рэформавання, падзенне аўтарытэту манархіі. Рэформы Цюрго. Скліканне Генеральных штатаў і канфлікт саслоўяў з уладай. Узяцце Бастыліі. Устаноўчы сход. Панаванне канстытуцыялістаў. Адмена феадальных павіннасцей. “Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна”. Канстытуцыя 1791 г. Рост рэвалюцыйных таварыстваў і клубаў. Варэнскі крызіс. Рост рэспубліканскага руху. Паўстанне 10 жніўня 1792 г. і прыход да ўлады жырандыстаў. Устанаўленне рэспублікі.

Пільніцкая дэкларацыя і пачатак рэвалюцыйных войн. Арганізацыя жыцця ва ўмовах вайны. Перамогі французскай арміі. Супраціўленне рэвалюцыі. Вандэя. Нарастанне крызісных з’яў у эканоміцы. Агітацыя плебейскіх рэвалюцыянераў. Супярэчнасці ўнутры рэспубліканскага блока.

Устанаўленне якабінскай дыктатуры. Мерапрыемствы ў галіне палітыкі, эканомікі, рэлігіі, культуры. Канстытуцыя 1793 г. Якабінскі тэрор і праблема яго інтэрпрэтацыі ў гістарыяграфіі. Плыні і супярэчнасці ўнутры якабінскага блока. Крызіс якабінскай дыктатуры і яго складаючыя.

### *Тэма 18. Культура і паўсядзеннае жыцце Францыі перыяду Французскай рэвалюцыі*

Саслоўі і саслоўныя групы Францыі, іх лад жыцця і маральныя прыярытэты. Грамадская думка і роля публіцыстыкі. Абуджэнне краіны ў перыяд склікання Генеральных Штатаў.

Сацыяльнае бражэнне і абвастрэнне сітуацыі. Бастылія і яе разбурэнне. Нарастанне эканамічных складанасцей. Паход народа на Версаль. Бегства арыстакратаў за мяжу. Палітычныя клубы і выданні і іх дзейнасць. Рэвалюцыя і рэлігія. Якабінская дыктатура і антыкаталіцкі рух. Культ Вярхоўнай Істоты. Рэспубліканскі эіычны ідэал. Увядзенне рэвалюцыйнага календара і новых імёнаў для дзяцёй. Уніфікацыя мер і вагі. Абвяшчэнне бясплатнай абавязковай адукацыі. Стварэнне вышэйшых навучальных устаноў.Ператварэнне Луўра ў Нацыянальны музей, Каралеўскай Бібліятэкі – ў Нацыянальную бібліятэку. Рэвалюцыйныя гімны, пьесы, грамадзянскія цырымоніі. Змяненні ў модзе і этыкеце. Тэорыя, практыка і канкрэтныя праявы якабінскага тэрора. Псіхалагічны стан грамадства. Змяненні ў штодзенным жыцці пасля тэрмідарыянскага пераварота. Сацыяльныя канфлікты. “Нуварышы” як асобная сацыяльная група. Новая мода і лад жыцця. Барацьба жанчын за свае правы. Жанчыны ў перыяд рэвалюцыі.

### *Тэма 19. Тэрмідарыянскі пераварот. Дырэкторыя і Консульства*

Прычыны і ход пераварота 9 тэрмідора. Сацыяльная база і мерапрыемствы новай ўлады. Канстытуцыя 1795 г. Сістэма кіравання Дырэкторыі. Працяг войн і знешнепалітычныя поспехі Францыі. Напалеон Банапарт. Нестабільнасць і “палітыка качэлей” унутры краіны. Г. Бабеф і “змова роўных”. Пагаршэнне знешнепалітычнай сітуацыі ў 1798 г. Егіпецкі паход Банапарта і яго няўдача. Вайна з другой кааліцыяй. Разгром французскіх войскаў у Італіі.

Унутраная нестабільнасць і пераварот 9 лістапада 1799 г. Сутнасць сістэмы Консульства. Асаблівасці Канстытуцыі 1799 г. Раздрабленне заканадаўчай улады і падкантрольнасць консулу судовай. Сацыяльны арбітраж Напалеона. Канкардат 1801 г. з папай. Фінансавая і эканамічная стабілізацыя. Рэферэндум 1802 г. аб пажыццёвым кіраванні першага консула.

Інтэрпрэтацыі характару і значэння Вялікай французскай рэвалюцыі ў сучаснай гістарыяграфіі.

## Раздзел II. Краіны Еўропы і Амерыкі ў XIX – пачатку XX ст.

### *Тэма 20. Напалеонаўская Францыя і Еўропа*

Абвяшчэнне Першай імперыі і яе сацыяльная база. Сутнасць банапартызма. Аднаўленне атрыбутаў манархічнай улады. Складанне новага імперскага дваранства. Напалеонаўскі кодэкс. Разгортванне прамысловай рэвалюцыі. Паліцэйская сістэма і цэнзура. Стварэнне ліберальнай апазіцыі.

Характар і мэты напалеонаўскіх войн. Антыфранцузскія кааліцыі. Барацьба з Англіяй і кантынентальная блакада. Войны з Аўстрыяй і Прусіяй.

Роля Расіі ў антыфранцузскіх кааліцыях. Тыльзіцкі мір. Скасаванне Свяшчэннай Рымскай імперыі Буржуазныя ператварэнні ў заваяваных краінах. Вайна ў Іспаніі і супраціўленне мясцовага насельніцтва. Пагаршэнне адносін з Расіяй і вайна 1812 г. "Бітва народаў" пры Лейпцыгу. Уступленне саюзных войскаў у Парыж. Адрачэнне Напалеона ад прастолу і высылка на в. Эльбу.

Рэстаўрацыя Бурбонаў і вяртанне дарэвалюцыйных парадкаў. Бегства Напалеона з Эльбы і "сто дзён". Паражэнне Напалеона пры Ватэрлоо. Выгнанне Напалеона на в. Св. Алены і заканчэнне яго жыцця. Асоба і дзейнасць Напалеона і іх ацэнкі ў гістарыяграфіі.

### *Тэма 21. "Венская сістэма". Развіцце міжнародных адносін у Еўропе ў XIX – пачатку XX ст.*

Венскі кангрэс. Прынцып легітымізма. Манархічная рэстаўрацыя. Становішча Францыі. Роля Расіі на кангрэсе. Змены на палітычнай карце Еўропы. "Свяшчэнны саюз" і яго задачы. Роля "Венскай сістэмы".

Сутнасць "усходняга пытання". Барацьба паўдневаславянскіх народаў за незалежнасць. Вызваленчая барацьба ў Грэцыі і руска-турэцкая вайна 1828–1829 гг. Роля заходніх краін у атрыманні Грэцыяй незалежнасці. Буйнейшыя дзяржавы і іх інтарэсы на Балканах. Крымская вайна і яе вынікі. Барацьба Расіі за ўмацаванне на Балканах у другой палове XIX ст. Руска-турэцкая вайна. Сан-Стэфанскі мір. Стварэнне новых дзяржаў на Балканах. Берлінскі кангрэс.

Уплыў на міжнароднае становішча аб'яднання Італіі і Германіі. Англа-германскія і франка-германскія супярэчнасці. Франка-пруская вайна. "Саюз трох імператараў". Перадумовы збліжэння Расіі і Францыі. Руска-германскія супярэчнасці. Складанне Траістага саюза і Антанты. Мілітарызацыя Еўропы. Гонка ўзбраенняў. Балканскія войны. Сараеўскае забойства. Дыпламатычныя падзеі напярэдадні Першай сусветнай вайны.

### *Тэма 22. Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіцце Еўропы ў XIX – пачатку XX ст.*

Набыццё Еўропай статусу сусветнага лідэра. Навукова-тэхнічны прагрэс і навуковая рэвалюцыя. Прамысловы пераварот. Краіны-лідэры індустрыяльнага развіцця. Капіталізм даманапалістычны і манапалістычны. Віды манаполій. Банкаўская сістэма. Фінансавая алігархія. Вываз капітала за мяжу. Капіталістычныя адносіны ў аграрным сектары. Развіццё воднага транспарту, чыгункі, дарог. Урбанізацыя. Міграцыі і сацыяльная мабільнасць.

Змяненне ўмоў паўсядзеннага жыцця. Фарміраванне агульнадаступнай сістэмы навучання і масавай культуры. Спорт і турызм. Сацыякультурнае асяроддзе горада. Развіцце музеяў і выставачнай дзейнасці. Распаўсюджанне кінематографа. Эмансіпацыя жанчын, яе праявы і наступствы.

Стварэнне і развіцце класаў буржуазнага грамадства. Сацыяльныя кантрасты капіталістычнага ладу. Палітыка "начного вартаўніка" і філантропія. Капіталістычнае развіцце і дзяржаўная ўлада. Англійская палітычная эканомія.

Мальтузіянства. Кансерватызм і ліберальны кансерватызм. Лібералізм класічны і сацыяльны.

Фарміраванне буржуазнай дэмакратыі і заходняй палітычнай культуры. Палітычны лад еўрапейскіх краін. Падзел каланіяльных уладанняў. Нераўнамернасць эканамічнага і палітычнага развіцця краін.

Каталіцкая царква і папства ў XIX ст. "Сілабус". Сацыяльныя рэаліі і змены ў палітыцы царквы. Була "Рэрум наварум". Клерыкальная ідэалогія.

### *Тэма 23. Рабочы рух і стварэнне I і II Інтэрнацыяналаў. Марксізм. Сацыялістычныя дактрыны другой паловы XIX– пачатку XX ст.*

Фарміраванне прамысловага пралетарыяту. Структура рабочага класа і ўмовы яго жыцця. Палітыка дзяржавы ў рабочым пытанні. Эканамічная і палітычная барацьба. Лудызм. Ліёнскія паўстанні 1830-х гг. Паўстанне сілезскіх ткачоў. Стварэнне прафесійных саюзаў. Трэд-юніёны. Амерыканская федэрацыя працы. "Індустрыяльныя рабочыя свету".

Утапічны сацыялізм. Узнікненне марксізму. "Маніфест Камуністычнай партыі". Абвяшчэнне I Інтэрнацыянала. Пруданізм. Бакунізм. Бланкісты. Пасібілісты. I Інтэрнацыянал і Парыжская камуна. Стварэнне сацыял-дэмакратычных партый у Еўропе. Барацьба плыняў у сацыял-дэмакратыі. Лейбарысцкая партыя. Анархізм і анарха-сіндыкалізм. Передумовы стварэння II Інтэрнацыянала і яго абвяшчэнне. Плыні ў II Інтэрнацыянале. Рэвізіянізм. Рэфармісцкі і рэвалюцыйны шляхі ў сацыял-дэмаркатыі. Першая сусветная вайна і лёс еўрапейскай сацыял-дэмакратыі. Крах II інтэрнацыянала. Значэнне рабочага руху і сацыялістычных дактрын у еўрапейскай гісторыі.

### *Тэма 24. Англія ў XIX – пачатку XX ст.*

Англія – "майстэрня свету". Асаблівасці сістэмы кіравання. Парламент. Двухпартыйная сістэма. Кабінет міністраў. Палітычная роля караля. Каралева Вікторыя і віктарыянская эпоха. Сацыяльныя супярэчнасці. Хлебныя законы. Становішча рабочага класа. Узнікненне фабрычнага заканадаўства. Чартызм. Трэд-юніянізм. Стварэнне лейбарысцкай партыі. I Інтэрнацыянал.

Першая і другая выбарчая рэформы ў Англіі. Законы аб галасаванні і трэцяя парламенцкая рэформа. Суфражскі рух. Сацыяльнае заканадаўства другой паловы XIX ст. Ірландскае пытанне. Фенії. "Маладая Ірландыя". Меры ўрада па рэгуляванні ірландскай праблемы.

Каланіяльныя валоданні Англіі. Брытанскае панаванне ў Індыі. Сутыкненне каланіяльных інтарэсаў Англіі і інтарэсамі буйнейшых еўрапейскіх краін. Англа-афганскія войны. Закабаленне Кітая. Опіумныя войны. Захоп Новай Зеландыі. Пашырэнне валоданняў Англіі у Канадзе.

Знешняя палітыка Англіі. Курс на падтрыманне "еўрапейскай раўнавагі". Англа-рускія супярэчнасці ва "ўсходнім пытанні". Адносіны з Турцыяй і Францыяй. Англа-германскае саперніцтва. Англія ў ваенных блоках напярэдадні Першай сусветнай вайны.

Культура і лад жыцця англійскага грамадства. Маральна-этычныя прыярытэты віктарыянскай эпохі. Навука і філасофія. Дарвінізм і пазітывізм. Рамантызм, рэалізм і дэкаданс у літаратуры (Дж. Байран, В. Скот, П. Шэлі, Дж. Кітс, Дж. Осцін, гатычны раман, Ч Дыкенс, У. Тэкерэй, Дж. Б. Шоу, О. Уайльд, Т. Эліот і г.д.). Англійскае мастацтва. Рэалісты і прэрафаэліты.

### *Тэма 25. Францыя ў XIX – пачатку XX ст.*

Агульныя ўмовы развіцця краіны ў пачатку XIX ст. Палітычныя групоўкі ў грамадстве. Рэжым Рэстаўрацыі. Людовік XVIII. Ультрараялізм. Карл X. Фарміраванне апазіцыі. Каралеўскія арданансы 25 ліпеня 1830 г. Ліпеньская рэвалюцыя. "Хартыя 1830 г.". Луі-Філіп Арлеанскі – "кароль банкіраў". Эканамічны ўздым. Сацыяльная палярызацыя грамадства. Становішча рабочага класа. Ліёнскае паўстанне. А. Бланкі, Л. Блан, Ж. Прудон. Прэм'ерства Ф. Гізо. Наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі.

Рэвалюцыя 22 лютага 1848 г. Часовы ўрад і яго склад. Мерапрыемствы буржуазных рэспубліканцаў. Люксембургская камісія і "нацыянальныя майстэрні". Канстытуцыя Другой рэспублікі. Чэрвеньскае паўстанне. Рост сацыяльнай незадаволенасці. Палітычная дзейнасць Луі Напалеона. Пераварот 2 снежня 1851 г. Сутнасць рэжыму Другой імперыі. Банапартызм. Эканамічны рост і дзелавая актыўнасць. Апазіцыйны рух у краіне. Знешняя палітыка Другой імперыі. Удзел у Францыі ў Крымскай вайне. Стварэнне французскай каланіяльнай імперыі (Індакітай, Алжыр, замацаванне ў Егіпце, вайна ў Мексіцы). Франка-пруская вайна і яе вынік. Рэвалюцыя 4 верасня 1870 г. і падзенне Другой імперыі. Паўстанне ў Парыжы 18 сакавіка. Парыжская камуна і яе мерапрыемствы. Паражэнне Камуны і яе гістарычнае значэнне.

Устанаўленне Трэцяй Рэспублікі. Разнастайнасць партыйнага спектра. Палітычная нестабільнасць. Эканамічнае развіцце і рабочы рух у канцы XIX – пачатку XX ст. Знешняя палітыка Францыі ў пачатку XX ст.

Духоўная культура Францыі. Філасофія і навука. Літаратура (В. Гюго, П. Беранжэ, Стэндаль, Э. Заля, Г. Флабэр, Г. дэ Мапасан, А. Франс, Р. Ралан і інш.). Мастацтва: ад Ж.-Л. Давіда да П. Пікасо. Музыка (Г. Берлёз, Ж. Бізэ, Ш. Гуно, К. Сен-Санс і г.д.). Скульптура (А. Радэн). Тэатр.

### *Тэма 26. Германія ў XIX – пачатку XX ст.*

Раздробленасць краіны. Афармленне Германскага саюза. Прамысловы пераварот. Прускі шлях развіцця аграрных адносін. Юнкерства. Буржуазія. Фарміраванне пралетарыята. Эканамічны крызіс 1847 г. Рэвалюцыя 1848 г. Сакавіцкая рэвалюцыя ў Прусіі. Бадэнскае рэспубліканскае паўстанне. Дзейнасць К. Маркса і Ф. Энгельса. Франкфурцкі парламент. Дзяржаўны пераварот у Прусіі 9 лістапада 1848 г. Мантэйфельская канстытуцыя і закон аб выкупе сялянскіх павінасцей. Канстытуцыя 1849 г.

Аўстра-прускі дуалізм і барацьба за гегемонію. Аб'яднанне Германіі пад эгідай Прусіі. Абвяшчэнне Германскай імперыі. О. Бісмарк і яго палітычная праграма. Эканамічны рост, мадэрнізацыя і мілітарызацыя краіны. Улада і

царква. “Культуркампф”. Буржуазныя партыі. Рабочы рух і стварэнне сацыял-дэмакратычнай партыі. Роля СДПГ ў палітычным жыцці. Знешняя палітыка Германіі. Каланіяльныя інтарэсы Германіі. Англа-германскія супярэчнасці. Адносіны Германіі і Расіі. Германія ў сістэме Траістага саюза.

Дасягненні духоўнай і матэрыяльнай культуры Германіі. Класічная філасофія і філасофскія пошукі на мяжы XIX–XX ст. (Г. Гегель, Л. Фейербах, А. Шапенгаўэр, О. Шпенглер, Ф. Ніцшэ і г.д.). Германская навука і тэхніка. Літаратура (Г. Гейнэ, браты Грым, Т. Шторм, Т. Фантанэ і інш.), музыка (Л. ван Бетховен, А. Шуман, К. Вебер, Р. Вагнер, і г.д.). Экспрэсіянізм ў мастацтве.

### *Тэма 27. Аўстрыйская імперыя ў XIX – пачатку XX ст.*

“Сістэма Меттэрніха”. Легітымізм і кансерватызм. Сакавіцкая рэвалюцыя 1848 г. у Аўстрыі. Рэвалюцыя ў Венгрыі, паўстанні ў Мілане і Венецыі. Вызваленчы рух у славянскіх абласцях імперыі. Абвяшчэнне незалежнасці Венгрыі. Рэвалюцыйныя падзеі ў Вене. Ольмюцкая канстытуцыя. Вынікі рэвалюцый у Аўстрыі і Венгрыі.

Развіцце краіны пасля рэвалюцыі. Неаабсалютызм. Барацьба з Прусіяй за гегемонію. Аўстра-пруская вайна і бітва пры Садовай. Пагадненне 1867 г. і стварэнне дуалістычнай манархіі. Унутрыпалітычнае развіццё Аўстра-Венгрыі. Разгортванне прамысловага пераварота. Рабочы рух. Знешняя палітка. Інтарэсы Аўстрыі ў Цэнтральнай Еўропе і на Балканах. Аўстра-Венгрыя ў сістэме блокаў напярэдадні Першай сусветнай вайны.

Сацыякультурнае развіцце грамадства. Навука. Тэхнічныя вынаходніцтвы. Тэатр. Музыка. Венская музычная школа.

### *Тэма 28. Італія і Іспанія ў XIX – пачатку XX ст.*

Раздробленасць Італіі. Асаблівасці эканомікі ў розных італьянскіх рэгіёнах. Палітычнае развіццё. Княскі абсалютызм. Роля папства. Праблемы аб’яднання краіны і нацыянальнае пытанне. Тайныя таварыствы першай чвэрці XIX ст. Карбанарыі. Буржуазная рэвалюцыя 1820 г. Аўстрыйская інтэрвенцыя ў Неапалі. Рэвалюцыя 1821 г. у П’емонце. Плыні ў нацыянальна-вызваленчым руху Італіі (Д. Мадзіні, Дж. Гарыбальдзі, К. Кавур).

Рысарджымента. Рэвалюцыя 1848 г. Рымская і Венецыянская рэспублікі. Праблема аб’яднання краіны і розныя варыянты яе вырашэння. Пазіцыя еўрапейскіх краін па праблеме аб’яднання Італіі. Франка-аўстрыйская вайна 1859 г. і вызваленне Ламбардыі. Паход “тысячы” Гарыбальдзі. Рэвалюцыя на поўдні Італіі. Далучэнне Папскай вобласці. Унутранае развіцце і знешняя палітыка Італіі ў другой палове XIX – пачатку XX ст..

Асаблівасці эканамічнага і палітычнага развіцця Іспаніі. Іспанія ў перыяд напалеонаўскіх войн. Перадумовы рэвалюцый першай паловы XIX ст. Буржуазная рэвалюцыя 1820 г. Інтэрвенцыя Францыі. Аднаўленне абсалютызму і карлісцкая вайна. Рэвалюцыя 1834–1843 г. Дыктатура Нарваэнса. Рэвалюцыя 1845–1856 гг. Прыход лібералаў да ўлады. Рэвалюцыя 1868–1874 гг. Развіццё Іспаніі ў другой палове XIX – пачатку XX ст..

Культурныя дасягненні Іспаніі і Італіі. Музыка (Дж. Расіні, В. Беліні, Г. Даніцэці, Д. Вердзі, Дж. Пучыні і інш.), мастацтва (Ф. Гойя) і інш.

### *Тэма 29. ЗША ў XIX – пачатку XX ст.*

Тэрытарыяльны рост ЗША. Палітычны лад і кіраванне. "Джэксанаўская дэмакратыя". Каланізацыя Захаду. Англа-амерыканская вайна. Разгортванне прамысловага пераварота. Спецыфіка і праблемы Поўначы і Поўдня. Абаліцыянізм. Стварэнне дэмакратычнай і рэспубліканскай партый. Негрыцянскія паўстанні. Місурыйскі кампраміс. Рост напружанасці ў адносінах паміж паўднёвымі і паўночнымі штатамі. Прэзідэнцтва А. Лінкальна. Грамадзянская вайна. Закон аб гамстэдах. Адмена рабства. Перамога Поўначы. Рэканструкцыя. Змяненні на Поўдні.

Асаблівасці эканомікі ЗША. Завяршэнне прамысловага пераварту. Манаполіі і банкі. Вываз капітала за мяжу. "Амерыканскі шлях" развіцця аграрнага сектара. Фермерскі рух. Рабочы рух і прафсаюзная дзейнасць. Амерыканская федэрацыя працы. "Індустрыяльныя рабочыя свету".

Накірункі знешняй палітыкі ЗША. ЗША і еўрапейскія краіны. Дактрына Манро. Панамерыканізм. "Палітыка вялікай дубінкі". "Дыпламатыя долара". Інтарэсы ЗША на Далёкім усходзе.

Спецыфіка амерыканскага светапогляду і ладу жыцця. Развіцце навукі і тэхнікі. Тэхнічныя вынаходніцтвы (Т. Эдысан, В. Паўльсэн, Э. Берлінэр і г.д.). Літаратура (Г. Бічэр-Стоу, Б. Гарт, М. Твен, Дж. Лондан, Т. Драйзер і г.д.). Мастацкае калекцыяніраванне. Заснаванне Музея Метраполітэн ў Н'ю-Йорку, мастацкіх музеяў у Чыкага, Бостане, Філадэльфіі і г.д. Узнікненне Галівуда.

### *Тэма 30. Расійская імперыя ў I палове XIX ст.*

Тэрыторыя і насельніцтва. Класы і саслоўі. Асаблівасці палітычнага ладу. Александр І і ліберальныя праекты пачатку стагоддзя. Дзейнасць Сперанскага. Рэфомы ў галіне кіравання, адукацыі, закон "аб вольных хлебапашцах" і г.д. Знешняя палітыка Расіі ў пачатку XIX ст. Удзел у антыфранцузскіх кааліцыях. Тыльзіцкі мір і франка-расійскія супярэчнасці. Вайна 1812 г. Роля Расіі на Венскім кангрэсе і ў стварэнні Свяшчэннага Саюза.

Кансерватыўны этап у кіраванні Аляксандра І. Аракчэеўшына. Расія ў Свяшчэнным Саюзе. Рух дзекабрыстаў і яго мэты. Паўстанне дзекабрыстаў і яго вынікі. Развіццё грамадскай думкі ў першай палове XIX ст. Заходнікі і славянафілы. Пачатак дзейнасці рэвалюцыянераў-разначынцаў.

Умацаванне кансерватыўных тэндэнцый падчас кіравання Мікалая І. "Тэорыя афіцыйнай народнасці".Крызіс прыгонніцтва. Асаблівасці эканомікі дарэформеннай Расіі. Сялянскае пытанне. Рэформы Кісялева. Накірункі знешняй палітыкі Расіі. Расія і еўрапейскія рэвалюцыі. Вайна на Каўказе. "Усходняе пытанне". Крымская вайна.

Уклад жыцця і маральныя стандарты розных катэгорый насельніцтва. Уплыў асветніцтва, рамантызм і сентыменталізм (М. Карамзін, А. Пушкін, В. Жукоўскі, М. Лермантаў, А. Грыбаедаў і інш.). Крытычны рэалізм (М. Гогаль).

Росквіт рускага мастацтва (В. Трапінін, К. Брулоў, А. Іваноў, П. Фядотаў і г.д). Музыка (М. Глінка). Развіцце друку і публіцыстыкі.

### *Тэма 31. Расійская імперыя ў II палове XIX ст.*

Аляксандр II. Падрыхтоўка адмены прыгоннага права. Маніфест 19 лютага 1861 г. і Палажэнні аб новай арганізацыі сялянскай гаспадаркі. ”Эпоха вялікіх рэформ”. Лібералы і кансерватары. Рэвалюцыянеры-народнікі і плыні ў народніцтве. Забойства Аляксандра III. Аляксандр III і яго палітычныя прыярытэты. Контррэформы. Расійская імперыя і нацыянальнае адраджэнне імперскіх ускраін. Народніцкі і сацыял-дэмакратычны рух. Распаўсюджанне марксізма. “Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа”. Стварэнне РСДРП.

Эканамічнае развіцце парэформеннай Расіі. З’яўленне новых сацыяльных груп. Міграцыі насельніцтва і урбанізацыя. Сельская гаспадарка і спалучэнне розных сістэм гаспадарання. “Прускі шлях” развіцця аграрных адносін і яго праявы. Знешні і ўнутраны гандаль і шляхі зносін. Банкі і крэдыт. Замежныя капіталы. Фарміраванне пралетарыята і буржуазіі.

Прыярытэты знешняй палітыкі Расіі. “Саюз трох імператараў”. Франка-рускі саюз. Інтарэсы Расіі на Балканах і Далекім Усходзе. Руска-турэцкая вайна. Далучэнне да Расіі тэрыторый Сярэдняй Азіі. Расія ў Антанце.

